Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. ЧАЦВЕР № 199 (28057) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Рэха Другой сусветнай вайны** СТАР. 3

Сямейная газета



**Манастыр, што помніць Напалеона**



**Пярсцёнак як масток у мінулае**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр АКЕНЦЬЕЎ, архітэктар унітарнага прадпрыемства «Мінскграда»:**

*«Згодна з новай рэдакцыяй генеральнага плана Мінска, чацвёртую лінію сталічнага метро зробяць кальцавой. Падрабязныя этапы і параметры асваення, эканамічныя абгрунтаванні будуць выкананы ў спецыяльнай рабоце «Комплексная транспартная схема Мінска». Плануецца стварыць і новы від пасажырскага транспарту — хуткасны трамвай. У перспектыве ён звяжа сталіцу з Лагойскам, Кітайска-беларускім індустрыяльным паркам, пасёлкам Сокал і Нацыянальным аэрапортам «Мінск».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17343,00 ▲ | |
| Еўра | 19793,00 ▲ | |
| Рас. руб. | 274,76 ▼ | |
| Укр. грыўня | 798,68 ▲ | |

ISSN 1990 - 763X

# ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

**Літаральна днямі жыхарка хутара Гярчаны, што на Браслаўшчыне, Часлава Казіміраўна ЗІНКЕВІЧ адзначыла сваё 85-годдзе. У свае гады бабуля з задавальненнем працуе на зямлі. Сёлета на яе агародзе асабліва ўрадзіла цыбуля. А якія кветкі каля яе дома растуць — на зайздрасць усім суседзям!**

**Жыццё ў бабулі Чаславы, як і ва ўсіх з яе пакалення, было нялёгкім. У юнацтве зведала яна жахі вайны, пад кулямі і снарадамі ўцякала і хавалася ад карнікаў у лесе, вярнулася адтуль на папялішча роднай хаты. Шмат гадоў пасля ліхалецця Часлава працавала на палявых работах, шчыравала і на сваёй гаспадарцы. Паставілі з мужам дом, у якім пасялілася іхняе сапраўднае шчасце — тры дачкі. Цяпер у Чаславы Казіміраўны шэсць унукаў і чатыры праўнукі. Усіх іх яна чакае на родным парозе. Нягледзячы на тое, што нашчадкі жывуць далёка ад Браслаўшчыны — у Латвіі, ва Украіне, на Брэстчыне, яны заўсёды спяшаюцца на хутар пад шатамі старых яблынь...**

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**



■ Законы існавання

# «БІЯГРАФІЯ» СПАДЧЫННАСЦІ,

## або Навошта пашпарты жывёлам і раслінам



**Апошнія дзесяцігоддзі генетычная навука развівалася сямімільнымі крокамі, і тое, што яшчэ ўчора здавалася фантастычным, сёння для генетыкаў ужо пройдзены этап. Прагрэс у галіне генетыкі супастаўны хіба толькі з тым, што адбывалася з камп'ютарнай тэхнікай за кароткі час... З'яўленне і імклівае развіццё геннай інжынерыі перавярнула ўсе ранейшыя ўяўленні пра магчымае і немагчымае. Распрацаваныя метады генетычнай трансфармацыі адкрылі неабмежаваныя магчымасці ў наданні жывым арганізмам пажаданых уласцівасцяў. Выведзеныя ў лабараторыях расліны надзяляюцца такімі каштоўнымі агранамічнымі якасцямі, як устойлівасць да гербіцыдаў, насякомых і вірусаў, засуха- і холадаўстойлівасць, у іх штучна рэгулюецца колькасць крухмалу, якасць бялку, валокнаў, памеры і нават форма пладоў, густавыя якасці, ураджайнасць культур і г.д. У таматы дабаўляецца ген, які кансервуе тканкі плода і дазваляе значна падоўжыць тэрмін іх захоўвання.**

**50-гадоваму юбілею Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук была прысвечана міжнародная навуковая канферэнцыя «Генетыка і біятэхналогіі XXI стагоддзя: праблемы, дасягненні і перспектывы», якая сабрала навукоўцаў з Расіі, Украіны, Казахстана, Грузіі, Малдовы, Турцыі і Польшчы.**

### ВЯРШКІ І КАРЭНЬЧЫКІ

— Ролю генетыкі ў сучасным свеце цяжка пераацаніць, — упэўнены **першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук акадэмік Сяргей ЧЫЖЫК.** — З яе поспехамі звязаны надзеі чалавецтва на стварэнне найноўшых біятэхналогій для сельскай гаспадаркі, харчовай прамысловасці, для медыцыны і спорту, аховы навакольнага асяроддзя і крыміналістыкі. Дасягненні генетычнай навукі прымяняюцца нават у гандлі, паколькі перасоўванне тавараў білагічнага паходжання паміж дзяржавамі вымагае дадатковых мер кантролю.

Інстытут генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі — вядучая навуковая арганізацыя, якая распрацоўвае праблемы генетыкі, геномікі і біятэхналогіі. Сёння ў яго складзе працуюць 10 навукова-даследчых лабараторый, генетыка-селекцыйны комплекс з эксперыментальнымі цяпліцамі і полем, цэнтр калектыўнага карыстання «Геном» і тры інавацыйныя структуры.

Адна з іх — Рэспубліканскі цэнтр геномных біятэхналогій — была адкрыта адносна нядаўна, напрыканцы 2011 года. Цэнтр — шматпрофільны: ён ахоплівае і сельскую гаспадарку, і ахову навакольнага асяроддзя, і спорт, і медыцыну.

— Дасягненні геномікі сталі асновай новых метадаў селекцыйнай працы, якія базіруюцца на выкарыстанні малекулярных маркераў і генна-інжынернай мадыфікацыі. Геномныя біятэхналогіі дазваляюць ацаніць якасць зыходнага селекцыйнага матэрыялу па наяўнасці пажаданых для селекцыянера генаў і кантраляваць іх у працэсе вывядзення новых сартоў раслін з зададзенымі ўласцівасцямі, — расказвае **галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук член-карэспандэнт акадэміі Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ** (кіраўнік Інстытута генетыкі і цыталогіі з 2004 па 2014 год. — **Аўт.**) — Яны дазваляюць таксама скараціць тэрміны стварэння новых сартоў раслін на 3-4 гады і зменшаюць пры гэтым выдаткі на 15-20%. Аналіз вядзецца больш чым па 70 генах. Выяўлены ДНК-маркеры генаў устойлівасці бульбы да хвароб і шкоднікаў. Распрацавана эфектыўная тэхналогія ДНК-тыпіравання генаў лёжкасці і саставу караціноідаў у таматах. Падабраныя ДНК-маркеры ўстойлівасці яблыні да паршы, мучністай расы, тлі... Пратэставаны серыі малекулярных маркераў жыта, ад якіх залежаць хлебапякарныя якасці мукі.

СТАР. 4

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗРОБІЦЬ РАБОЧЫ ВІЗІТ У КАЗАХСТАН

**Падчас візіту, які адбудзецца 15-16 кастрычніка, Прэзідэнт Беларусі возьме ўдзел у пасяджэннях Савета кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Парадак дня маючага адбыцца саміту СНД налічвае 17 пытанняў. У прыватнасці, плануецца прыняцце заяў кіраўнікоў дзяржаў СНД у сувязі з 70-годдзем стварэння ААН, 30-й гадавінай аварыі на Чарнобыльскай АЭС, аб барацьбе з міжнародным тэрарызмам. Акрамя таго, шэраг пытанняў прысвечаны далейшаму ўмацаванню ваеннага і прыгранічнага супрацоўніцтва. Будуць разгледжаны таксама кадравыя пытанні.

Кіраўнікам дзяржаў на Вышэйшым Еўразійскім эканамічным савеце прапанавана абмеркаваць асноўныя напрамкі міжнароднай дзейнасці, эканамічнага развіцця ЕАЭС, падыходы да развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з асноўнымі партнёрамі на сярэднетэрміновую перспектыву. Прэзідэнты разгледзяць парадак прыняцця ў ЕАЭС новых членаў і спынення членства ў саюзе, а таксама пытанне пачатку перагавораў з Дзяржавай Ізраіль наконт заключэння пагаднення аб зоне свабоднага гандлю. Парадак дня пасяджэння ўключае і арганізацыйныя пытанні.

■ Блізкая ўлада

## БУДЗЕ ТАКІ ДЗЕНЬ

**Аднавіць адзіныя дні ЖЭУ прапанаваў намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ падчас прамой тэлефоннай лініі, на якой было прынята 38 званкоў і больш за 80% з іх тычыліся пытанняў, што ўваходзяць у кампетэнцыю службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

Гэта і рамонт жылога фонду, і ўладкаванне дваровых тэрыторый, і тэхнічнае абслугоўванне дамоў, і многія іншыя. Кіраўнік узяў праблемы на асабісты кантроль і даў даручэнне разабрацца ў максімальна сціслыя тэрміны. Дарэчы, менавіта тэматыка ЖКГ пераважае ў зваротах грамадзян заўсёды, адзначыў Уладзімір Прывалаў:

— Неабходна, каб гэтыя пытанні замыкаліся менавіта на тых, хто імі непасрэдна займаецца. Для гэтага трэба аднавіць практыку правядзення адзіных дзён ЖЭУ і рэгулярных прамых тэлефонных ліній з кіраўніцтвам службаў ЖКГ. Не заўсёды людзі ведаюць тэлефоны аварыйных і інжынерных службаў, куды можна звяртацца ў выпадку той ці іншай непаладкі.

У цэлым у апошні час абазначылася тэндэнцыя зніжэння колькасці зваротаў грамадзян на прамыя суботнія лініі Гомельскага аблвыканкама. Па словах начальніка аддзела па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб аблвыканкама Аляксандра Логвіна, задаволены кожны трэці зварот, які паступіў на «прамую лінію» з пачатку года, больш як 30% знаходзяцца на кантролі, па астатніх дадзены тлумачэнні.

Тым часам на Гомельшчыне падрыхтоўка да ацяпляльнага сезона была завершана яшчэ да сярэдзіны верасня. Праведзены прафілактычны рамонт 608 камунальных крыніц цяпла і 271 цэнтральнага ацяпляльнага пункта, якія знаходзяцца на балансе службаў ЖКГ. Таксама завершаны рамонт інжынерных сістэм ацяплення жылых дамоў, адноўлена герметызацыя стыкаў сценавых панэляў буйнапанэльных жылых дамоў і падрыхтаваны ўсе цеплавыя вузлы. Камунальнікі пачалі ўжо падаваць цяпло ў жылы сектар.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. iost@zviazda.by ■

# У ВЯЛІКАЙ СЯМ'І І ДЗЕЦІ ШЧАСЛІВЫЯ

**Шмат мерапрыемстваў, звязаных з Днём маці, прайшло ўчора па ўсёй рэспубліцы. У іх узялі ўдзел і кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання. Намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА наведала ўчора сям'ю шматдзетнай жыхаркі Мінска Ганны Філінавай.**


Фота БЕЛТА.

«Такія сем'і, як ваша, — прыклад для іншых. У вялікай сям'і дзеці больш шчаслівыя», — выказала ўпэўненасць віцэ-прэм'ер, уручаючы падарункі дзецям.

Ганна і Сяргей Філінавы выхоўваюць пяцярых дзяцей — чацвярых хлопчыкаў і дзяўчынку. Малодшаму з іх — паўгода, старэйшаму — 10 гадоў. Двое старэйшых сыноў займаюцца ў музычнай школе на харавым аддзяленні і водным пола ў спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе алімпійскага рэзерву.

Бацька сямейства выкладае на кафедры хуткай медыцынскай дапамогі і медыцыны катастроф Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Ганна Філінава — дзіцячы псіхатэрапеўт. Паводле іх слоў, медыцынская адукацыя гадаваць дзяцей дапамагае.

«Шматдзетнай мамай у наш час быць лёгка — дзяржава надае нам дастаткова ўвагі, аказвае падтрымку. Акрамя таго, гэта пачэсна», — адзначыла Ганна Філінава. Сваіх дзяцей мама лічыць дружнымі.

Віцэ-прэм'ер пасля ўручэння салодкіх падарункаў, кніг, цацак і спартыўнага інвентару пагутарыла з усімі членамі вялікай сям'і.

БЕЛТА.

■ Форум

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ СУСВЕТНАГА ЎЗРОЎНЮ

IEC 79th GM MINSK 2015

**У трэці дзень дзейнасці форуму маладых спецыялістаў у рамках 79-й Генеральнай асамблеі МЭК яго юныя ўдзельнікі наведалі адзін з мадэрнізаваных аб'ектаў беларускай энергетыкі — ЦЭЦ-3 сталіцы.**


Фота БЕЛТА.

Спецыялісты форуму на свае вочы ўбачылі і даведаліся пра этапы мадэрнізацыі гэтай найбуйнейшай і найстарэйшай у краіне цеплаэлектрацэнтралі. Сёння гэтая ЦЭЦ ужо на прынцыпова новым узроўні сілкуе электрычнасцю і прамысловым парам каля 100 прадпрыемстваў горада, а таксама падае цяпло ў чвэрць жыллёвага сектара Мінска.

**Першы намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга» Аляксандр СІВАК** адзначыў, што МЭК з'яўляецца менавіта той арганізацыяй, якая шляхам стандартаў і дакладных правілаў вызначае напрамкі развіцця электратэхнічнай прамысловасці і энергетыкі. «Сёння нам неабходна ў сур'ёзнай звязцы з гэтай структурай трымаць руку на тэхналагічным пульсе планеты і дакладна ведаць, у якім напрамку рухаюцца сусветныя перадавыя тэндэнцыі. А тое, што асамблея МЭК праводзіцца ў нашай краіне, сведчыць аб высокай ацэнцы спецыялістамі айчыннага тэхнічнага патэнцыялу», — сказаў ён.

Аляксандр Сівак паведаміў, што буйнагабарытнае абсталяванне (генератары і турбіны) энергетыкі ў нашай краіне не вырабляецца, але цалкам закрываюць пытанні па стварэнні сістэмы вышэйшага кіравання тэхналагічнымі працэсамі станцыі. Менавіта нашы айчынныя спецыялісты з нуля распрацоўвалі гэтую сістэму, якая з'яўляецца сапраўды надзейнай і працуе ў аўтаматычным рэжыме. Доля лакалізацыі такой мадэрнізацыі была максімальнай.

Правесці высокатэхналагічную аперацыю па мадэрнізацыі старога аб'екта змогуць спецыялісты далёка не кожнай суседняй краіны. Спрацавалі на выдатна не толькі праекціроўшчыкі, электроншчыкі, наладчыкі і будаўнікі. Тут дзейнічала суцэльная каманда энергетыкаў, школа па стварэнні якіх у нашай краіне захавалася. Сёння спецыялісты падобных напрамкаў карыстаюцца попытам і за мяжой. Беларускія брыгады прафесіяналаў дапамагалі ажыццяўляць мадэрнізацыю і рэканструкцыю буйных аб'ектаў энергетыкі ў Індыі, Расіі, Казахстане і краінах Балтыі.

Сяргей КУРКАЧ. kurkach@zviazda.by ■

■ Меркаванне

# МЕРА АДКАЗНАСЦІ

Скажу адразу: я не супраць апазіцыі. Наадварот, абедзвюма рукамі «за». «Карысна вам разнадумнасць мець», — сказана ў Біблії, і хто ў цвярозым розуме запярэчыць гэтаму? Інстытуту апазіцыі чалавецтва абавязана, магчыма, самымі славутымі сваімі імёнамі. Успомнім Нэльсана Мандэлу, Марціна Лютэра Кінга, ды вось хаця б і чэшскага Вацлава Гавела... Усіх не пералічыць, і чытач, напэўна, назаве яшчэ дзясяткі і дзясяткі імёнаў. Дарэчы, і цяперашняя ўлада ў Беларусі ў свой час выйшла з апазіцыі: ужо гэта мы дакладна ведаем. Словам, устойлівая, разумная і адукаваная, прынцыповая, сумленная і, галоўнае, сацыяльна адказная апазіцыя — гэта тое, што рухае грамадства наперад. Элементарнае спаборніцтва кандыдатаў на любых палітычных (і нават непалітычных) выбарах — гэта ж таксама, трэба разумець, праява той самай біблейскай «разнадумнасці» і, значыць, поле супрацьборства паміж «рэжымам», няхай гэта будзе хоць бы закасцянелае кіраўніцтва якога-небудзь адміністрацыйнага раёна, і апазіцыяй.

Але, на жаль, бывае і так, што апазіцыя неразумная, несумленная, беспрынцыповая і, галоўнае, цалкам неадказная. І што ўжо зусім цікава, неадказная нават сама перад сабой. Гэта калі яна не адказвае і не збіраецца адказваць нават за ўласныя словы. Як у народнай прыказцы, «абы пракукарэкаць — а там хоць не відней».

...У глыбокай сваёй цікавасці да апазіцыі адкрываю адзін з сайтаў. Чытаю і разважаю. «На фоне падзей ва Украіне растуць спекуляцыі на тэму неабходнасці легітымацыі існуючай улады перад пагрозай незалежнасці Беларусі з боку Расіі. Спрыяльныя для рэжыму знешнепалітычныя ўмовы даюць падставу многім, як у Беларусі, так і за мяжой, для заклікаў да легалізацыі рэжыму. Адной з падстаў для легалізацыі можа стаць ацэнка выбарчай кампаніі як «больш дэмакратычнай» і «менш рэпрэсіўнай» у параўнанні з папярэднімі. Легалізацыя цяперашняй улады не толькі не абароніць незалежнасць Беларусі, але зробіць легітымнымі ўсе акты па здачы суверэнітэту, або ўжо падпісаныя ёй, або тыя, якія яна падпіша ў будучыні. Паспешныя ўступкі рэжыму, каб дагадзіць імгненнаму палітычнаму прагматызму, могуць прывесці да катастрофы ў будучыні».

Вы што-небудзь зразумелі? Я перачытаў гэты мудрагелісты набор слоў некалькі разоў: нічога не зразумеў. Што такое «легалізацыя рэжыму»? Памятаю з літаратуры, у злачынным або шпіёнскім свеце «легалізавацца» азначае выйсці з падполля і дзейнічаць на свабодзе пад прыкрыццём якога-небудзь мірнага занятку. Ці не так? Божа ж ты мой, ну хоць словы можна ўжываць у іх слоўнікавым, а не «апазіцыйным» значэнні?!

Але час, здаецца, спыніць цытаванне: ужо нецікава. У чым паднаготная? Яна вось у чым. Сваімі ініцыятывамі па дыпламатычным вырашэнні ўкраінскага крызісу Мінск і насамрэч добра ўмацаваў свой міжнародны аўтарытэт. Менавіта гэта і палохае апазіцыю. У яе ж як: чым горш людзям (беларусам, украінцам, каму заўгодна), тым больш у яе тэарэтычных шанцаў на поспех. Публіка такога роду ёсць асаблівы арганізм: ён сілкуецца бедамі народа і марнее ад яго поспехаў. А калі раптам прыходзіць да ўлады, уганяе народ у адну суцэльную і бясконцую бяду: прыклад пад бокам. Там жа таксама ўсё пачыналася з гутарак на тэму легітымнасці рэжыму. Нашы, праўда, па прастаце душэўнай вырашылі, што ён яшчэ і «нелегальны». Адукацыі, мусіць, не хапае.

Валерый ГАЛАВАЧ ■

## ПЫТАННЕ — АДКАЗ

### Прамыя тэлефонныя лініі працягваюцца

**Пачынаючы з сярэдзіны студзеня, міністры, кіраўнікі аблвыканкамаў, мэры і іх намеснікі адказалі на тысячы пытанняў і далі сотні даручэнняў адказным органам. Незалежна ад маштабу праблемы грамадзяне заўсёды могуць разлічваць на тое, што іх зварот трапіць па адрасе.**

Такая форма зносін у краіне створана ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

**У гэтую суботу, 17 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 на сувязь з грамадствам выйдуць:**

Брэсцкі аблвыканкам
першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васільевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212204260);

Гомельскі аблвыканкам
намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644);

Мінскі аблвыканкам
кіраўнік спраў МАРКЕВІЧ Іван Станіслававіч (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні МАЛАШКА Валерый Анатольевіч (80222501869);

Мінскі гарвыканкам
кіраўнік спраў КОТАЎ Мікалай Аляксандравіч (80172224444).

■ Добрая навіна

## КАБ РАСЛІ ЗДАРОВЫМІ

**Новы фізкультурна-аздараўленчы комплекс (ФАК) расчыніў дзверы ў горадзе Чэрвені, што на Міншчыне. Падчас урачыстай цырымоніі яго адкрыцця старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра адзначыў, што ўзвядзенне аб'ектаў такога кшталту мае на мэце клопат аб дзецях, каб яны раслі здаровымі, папаўнялі кагорту імён герояў спорту, у будучыні праслаўлялі краіну, і ў прыватнасці, чэрвеньскую зямлю, сваімі дасягненнямі.**

На будаўніцтва комплексу з абласнога і раённага бюджэтаў выдаткавана каля 88 млрд рублёў. Тут створаны выдатныя ўмовы для заняткаў спортам і аздараўлення ўсіх катэгорый насельніцтва, у тым ліку людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. У спартыўнай зале можна гуляць у валейбол, баскетбол, футбол, гандбол, праводзіць масавыя мерапрыемствы. Комплекс уключае ў сябе таксама басейны для аздараўляльнага плавання і для дзяцей, барцоўскую, трэнажорную, фітнес-залы, спартзалу з трыбунамі, якія могуць змясціць 164 балельшчыкаў. Штодзень комплекс пры поўнай загрузцы можа прыняць каля 1000 чалавек.

Для насельніцтва некаторыя паслугі будуць на платнай аснове, але для групавых і сямейных заняткаў, для дзяцей, пенсіянераў, інвалідаў прадугледжаны зніжкі. ФАК перададзены Чэрвеньскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву. Установа плануе адкрыць тут аддзяленне плавання для дзяцей, спецыяльныя класы па вольнай барацьбе, лёгкай атлетыцы, футболе.

Фізкультурна-аздараўленчыя комплексы ёсць практычна ва ўсіх раёнах вобласці, акрамя Капыльскага, Старадарожскага і Уздзенскага. Сёлета плануецца адкрыць такі спартыўны цэнтр у Стоўбцах, у наступным годзе — у Валожыне.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■

## ПРАЙГРАЎШЫХ НЕ БЫЛО. І НЕ БУДЗЕ

**Учора ў Дзяржынску адбылося ўрачыстае адкрыццё аддзялення сувязі №2, якое, па вялікім рахунку, і не закрывалася...**



Як патлумачыла **начальнік вузла паштовай сувязі Людміла ШЫМАНСКАЯ**, памяшканне галоўнай пошты райцэнтра даўно патрабавала істотнага рамонту — стварэння сучасных, больш камфортных умоў і для абслугоўвання кліентаў, і для працы апаратараў.

За досыць кароткі час паштавікі пастараліся зрабіць усё магчымае: у аддзяленні сувязі павялічана колькасць працоўных месцаў, устаноўлена сістэма электроннай чаргі, створаны ўмовы для камфортнага чакання. Да таго ж памяшканне аснашчана кандыцыянерамі, відэаназіраннем... Што да паслуг, то іх пералік застаўся ранейшым: поўны спектр...

На ўрачыстым адкрыцці аддзялення сувязі прысутнічаў старшыня Дзяржынскага райвыканкама Мікалай Арцюшкевіч, намеснік дырэктара Мінскага філіяла РУП «Белпошта» Алена Ішчук *(на здымку)*. Першым кліентам, а таксама тым, хто ў гэты дзень афармляў падпіску альбо адпраўляў лісты «1 клас», уручаліся памятныя паштовыя падарункі. Усе ахвотныя маглі выйграць сувеніры і ў паштовай віктарыне. Іншымі словамі, на святцы адкрыцця прайграўшых не было. Пасля свята, як плануюць паштавікі, не будзе таксама.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■

■ Векапомнае

# ІХ ПОДЗВІГ — У НАШЫХ СЭРЦАХ

39 капсул з зямлёй з месцаў пахавання воінаў-беларусаў, якія загінулі ўдалечыні ад Радзімы ў гады Другой сусветнай вайны, папоўнілі нішы крыпты Храма-помніка ў гонар Усіх Святых

**Падчас урачыстай цырымоніі, якая адбылася ў Дзень маці і ў праваслаўнае свята Пакроў Прасвятой Багародзіцы, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі прачытаў малітву за супакаенне душ загінулых і асвяціў капсулы з зямлёй.**

Нагадаем, першыя з іх былі закладзены Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Лукашэнкам 2 кастрычніка ў межах акцыі «Малітва за Беларусь». Ва ўрачыстай цырымоніі ўдзельнічалі кіраўнікі праваслаўнай, каталіцкай, мусульманскай і іўдзейскай рэлігійных канфесій, дыпламатычных прадстаўніцтваў сямі дзяржаў, адкуль была прывезена зямля (Германіі, Аўстрыі, Польшчы, Чэхіі, Венгрыі, Славакіі і Італіі).

— Вельмі важна і сімвалічна, што мы ўзгадваем герояў нашай Айчыны, якія аддалі свае жыцці за наша жыццё, свабоду і незалежнасць, — лічыць **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ.** — Мы, можа быць, асабліва ў дзіцячым і юнацкім узросце, яшчэ не ўсведамляем таго, дзеля чаго пацярпелі нашы папярэднія пакаленні. Сёння ўсё часцей даводзіцца чуць, што ў той ці іншай краіне адбываецца супраціўленне, ліецца кроў. Вось і пачынаем разумець толькі тады, калі нешта страчваем, асабліва самае дарагое і любімае. Памяць аб нашых героях заўсёды будзе ў Царстве Божым, у сэрцах старэйшага пакалення. І наша задача — зрабіць усё магчымае, каб аб папярэдніх пакаленнях памятала яшчэ і моладзь.



Фота Надзеі БУЖАН.

Падчас вызвалення Еўропы ад нацызму на яе тэрыторыі палегла звыш мільёна савецкіх салдат. Пахаваннямі воінаў-вызваліцеляў усыпана тэрыторыя ад Буга да Берліна. Гарнізонныя савецкія могілкі ў горадзе Дрэздэн, Германія, зямля Саксонія; магіла невядомага савецкага салдата ў Лейпцыгу, Германія, зямля Саксонія; мемарыяльны комплекс Дахау, Германія, зямля Баварыя; інтэрнацыянальныя воінскія могілкі Ранквайль-Вальдуна, Аўстрыя, зямля Форарльберг; канцлагер Майданэк, Люблін, Польшча; пахаванне савецкіх воінаў на Ходаўскіх могілках, Прага, Чэхія... 39 капсул з зямлёй з гэтых і іншых сапраўды святых месцаў заклалі ў спецыяльныя нішы валанцёры руху БРСМ «Добрае сэрца» з розных рэгіёнаў краіны.

Як адзначыў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, сёння надзвычай важна займацца асветніцкай і патрыятычнай работай, якая праводзіцца Беларускай праваслаўнай царквой, у прыватнасці ўсіхсвяцкім прыходам. «Дзеля таго, каб малады людзі памяталі аб сваіх продках, дзякуючы якім мы жывём у мірнай і квітнеючай дзяржаве», — падкрэсліў Мітрапаліт.

Пасля ўрачыстасці былі падведзены вынікі рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі», якая праводзілася ў межах супрацоўніцтва Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і Беларускай праваслаўнай царквы. У выглядзе фотаработ праваслаўных аб'ектаў, якія былі добраўпарадкаваны валанцёрамі на працягу года, юнакі і дзяўчаты прэзентавалі свае тэматычныя выставы. Дарэчы, толькі за сакавік—верасень яны аднавілі каля двухсот аб'ектаў! Падзякаваўшы за зробленую працу, Мітрапаліт Павел пагутарыў з моладдзю на розныя тэмы.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■

■ А не шкодзь!

## ЗА СЕТКІ І ВОСЦІ — ПА ЎСЁЙ СТРОГАСЦІ

**Толькі за адзін тыдзень дзяржінспектары канфіскавалі ў браканьераў 86 сетак даўжынёй каля 3,5 кіламетра і 167 кілаграмаў незаконна вылаўленай рыбы.**

Сеткавікі на возеры Завесна, якіх затрымалі работнікі Гарадоцкай міжрайінспекцыі, «нарыбачылі» на крымінальную справу: два мужчыны вылавілі 59 асобін рыбы, з іх 54 — ляшчы. Шкода склала больш за 30 мільёнаў рублёў.

— «Пастараўся» на Дняпры і жыхар Жлобіна: ва ўлоў парушальніка апроч іншай рыбы, трапілі 14 падустаў. Яшчэ нядаўна гэты від быў у Чырвонай кнізе. Ды і цяпер за кожную рыбку давядзецца заплаціць 1,6 мільёна рублёў, — распавяла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь** Вольга ГРАМОВІЧ. — Паўсотні кіламетраў ад дому праехалі два магіляўчаніны, каб парыбачыць сеткамі на вадаёме каля вёскі Полна. Рыбалка па-за законам будзе каштаваць ім 25 мільёнаў. Столькі ж заплаціць і браканьер, затрыманы на Мікашэвіцкім канале, хоць яго ўлоў зававажыў толькі на дзесяць кілаграмаў.

Рыбалка з восцямі дорага каштавала і вяскоўцу з Петрыкаўскага раёна. Аўтамабіль, на якім ён вяртаўся позна ўначы, усяго ў некалькіх метрах ад жылля спынілі супрацоўнікі ДАІ. У багажніку было два дзясяткі буйных рыбін і сама прылада незаконнага промыслу. Браканьер стане фігурантам крымінальнай справы і мусіць пакрыць нанесеную шкоду ў памеры каля 23,5 мільёна рублёў. Хаця застаецца толькі здагадвацца, колькі параненых восцямі рыбін пайшло на дно...

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Цярпець нядоўга...

## ПАТРЭБА МАЛАЯ — ПРАБЛЕМА ВЯЛІКАЯ,

### або Хутка прыбіральні будуць у крокавай даступнасці

**Пры адсутнасці ў краме і кавярні грамадскай прыбіральні доступ наведвальнікам павінен быць дазволены ў службовую. Пра гэта гаворыцца ў пастанове Міністэрства аховы здароўя №102 ад 12 кастрычніка. Дакумент уступае ў сілу праз 15 рабочых дзён з моманту яго падпісання.**

Тое ж датычыцца і аўтазаправачных станцый, іншых аб'ектаў грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання: калі там адсутнічае грамадская прыбіральня, грамадзянам не павінны адмаўляць у наведванні службовых.

Як адзначаецца ў пастанове, грамадскія прыбіральні павінны быць прадугледжаны ў харчовых крамах (якія праектуюцца) агульнай гандлёвай плошчай больш за 400 квадратных метраў, у крамах з універсальным асартыментам нехарчовых тавараў, спецыялізаваных і вузкаспецыялізаваных крамах, у тым ліку тых, што гандлююць мэбляй, будаўнічымі матэрыяламі, калі іх агульная гандлёвая плошча складае больш за 600 квадратных метраў.

Апроч гэтага, прыбіральні павінны быць прадугледжаны на плошчах, у парках і скверах, на тэрыторыі рэкрэацыйных зон населеных пунктаў, на тэрыторыі рынкаў, у будынках культурна-забаўляльнага і спартыўнага прызначэння, чыгуначных вакзалах і станцыях, аўтавакзалах і аўтастанцыях, аэрапортах ці ў крокавай даступнасці на тэрыторыі, прылеглай да згаданых аб'ектаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■

■ Ну і ну!

## ПАДМАН «У РАСТЭРМІНОЎКУ»

**Крымінальную справу па артыкуле «Махлярства» завялі ў дачыненні 25-гадовага жыхара горада Масты, які, быццам купляючы аўтамабілі ў растэрміноўку, аваладваў транспартнымі сродкамі.**

На яго «вуду» трапіла жанчына, падаўшы ў інтэрнэт аб'яву аб продажы «Аўдзі 80». «Пакупнік» знайшоўся — ён прапанаваў нават на два мільёны рублёў больш за заяўленую цану, але без папярэдняй аплаты і з яе растэрміноўкай на два месяцы. Першую палову сумы абяцаў заплаціць у канцы гэтага месяца, а другую — у наступным. Аднак усе тэрміны разліку даўно мінулі, а жанчына атрымала толькі 980 тысяч рублёў. Давялося звяртацца ў міліцыю.

Аператыўнікі крымінальнага вышуку выявілі гэтую машыну на... штрафстаянцы, куды яе даставілі супрацоўнікі ДАІ пасля затрымання кіроўцы за рулём у нецвярозым стане. Вярнуць аўтамабіль уладальніца можа без праблем, бо ён не рэгістраваўся на новага гаспадара. Але яна пакуль не спяшаецца (хоча атрымаць абяцаныя грошы?), і іншамарка знаходзіцца на стаянцы.

У ходзе расследавання ўстаноўлены яшчэ два выпадкі, калі гэты малады чалавек падмануў уладальнікаў аўтамабіляў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■

# «БІЯГРАФІЯ» СПАДЧЫННАСЦІ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

У адной з лабараторый інстытута было створана некалькі ліній трансгеннай бульбы на аснове беларускага сорту «Скарб». Распрацоўка беларускіх генетыкаў на практыцы рэалізуе казку пра вяршкі і карэньчыкі — гэта значыць, што ген, які адпуджвае ад бульбы каларадскага жука, выпрацоўваецца толькі ў бацвінні, а ў клубнях, што знаходзяцца ў зямлі без уздзеяння сонечнага святла, гэты ген увогуле адсутнічае, таму для здароўя чалавека няма ніякай пагрозы. Увогуле найбольшая колькасць распрацовак звязана, вядома ж, са стварэннем трансгеннай бульбы, паколькі яна для беларусаў не проста нацыянальны брэнд, але і другі хлеб. Таму агульная задача — зрабіць усё, каб захаваць ураджай.

**Створаны эталонныя генетычныя пашпарты для 170 сартоў і гібрыдаў раслін і больш як 1000 генетычных пашпартоў племянных жывёл.**

Вядуцца работы і над стварэннем трансгенных канюшыны, журавін, рапсу і лёну-даўгунцу. Са з'яўленнем апошняга ёсць надзея на адраджэнне беларускага льнаводства — не сакрэт, што сёння галоўнай праблемай з'яўляецца адсутнасць сартоў, якія дазваляюць атрымаць высакаякаснае льновалакно.

Дарэчы, трансгенная бульба ўжо высаджваецца на эксперыментальным палігоне. Для такіх палігонаў у краіне створана адпаведная заканадаўчая база. Але на палетках па-за палігонам трансгенных раслін пакуль няма.

## ЗАПРАШЭННЕ Ў... «ПАШПАРТНЫ СТОЛ»

Аляксандр Кільчэўскі расказаў, што ДНК-маркеры паспяхова выкарыстоўваюцца і для ідэнтыфікацыі і пашпартызацыі сартоў раслін. Цяпер сістэма ДНК-ідэнтыфікацыі адаптавана для дзесяці асноўных сельскагаспадарчых культур, якія вырошчваюцца ў Беларусі: пшаніцы, бульбы, ячменю, лёну, тамата, соі, сланечніка, грушы, яблыні, цукровых буракоў.

Для жывёлагадоўлі распрацаваны тэхналогіі ДНК-тэсціравання сельскагаспадарчых жывёл па генах, адказных за гаспадарча-каштоўныя якасці (малочную і мясную прадуктыўнасць, утрыманне тлушчу і бялку ў малацэ) і спадчынныя захворванні. З дапамогай геномных біятэхналогій вырашаецца і такая актуальная для народнай гаспадаркі краіны задача, як кантроль за паходжаннем племянных жывёл. Тэхналогіі генетычнай пашпартызацыі распрацаваны для чыстапародных племянных быкоў, парсюкоў і коней і паспяхова ўкараняюцца на абласных дзяржплемпрадпрыемствах.

Спецыялістамі Інстытута генетыкі і цыталогіі створаны эталонныя генетычныя пашпарты для 170 сартоў і гібрыдаў раслін і больш як 1000 генетычных пашпартоў племянных жывёл.

У апошнія гады беларускія генетыкі падключыліся да вырашэння актуальных праблем прыродаахоўнай дзейнасці — разгорнуты даследаванні па ацэнцы генетычнага стану папуляцый дзікіх жывёл. З выкарыстаннем геномных тэхналогій упершыню праведзены аналіз генетычнай структуры папуляцыі белавежскага зубра. Вядзецца праца з папуляцыямі высакароднага аленя і казулі. Для шэрагу ахоўных і рэсурсных відаў дзікіх жывёл (еўрапейскі зубр, еўрапейская казуля, высакародны алень, дзік) падабраныя спецыфічныя ДНК-маркеры, якія дазваляюць з высокай ступенню верагоднасці ўстанаўліваць відавую прыналежнасць біялагічнага матэрыялу, што адкрывае новыя магчымасці па іх выкарыстанні ў барацьбе з браканьерствам.

## ПЛЫВЕЦ ЦІ ФУТБАЛІСТ?

Паводле слоў **дырэктара Інстытута генетыкі і цыталогіі Валянціны ЛЕМЕШ,** вялікая ўвага ў Рэспубліканскім цэнтры геномных біятэхналогій надаецца даследаванням у галіне медыцынскай і спартыўнай генетыкі.

Апошняя дазваляе не толькі вызначыць фізічныя здольнасці чалавека, але і выявіць яго схільнасць да таго ці іншага віду спорту. Да таго ж вынікі даследавання дапамагаюць мінімізаваць і магчымыя рызыкі ў атлетаў, напрыклад, папярэдзіць выпадкі раптоўнай смерці падчас фізічных нагрузак — на трэніроўках або спаборніцтвах.

Пры ДНК-пашпартызацыі спартсменаў даследуюцца гены, ад якіх залежаць цягавітасць, сіла і хуткасць, гены, што аказваюць істотны ўплыў на стан апорна-рухальнага апарату, адаптацыю да гіпаксіі, здольнасць да аднаўлення пасля фізічных нагрузак: гены росту новых крывяносных сасудаў і гены транспарту кіслароду, гены, адказныя за ломкасць касцей, і гены рызыкі трамбозу, гены сардэчна-сасудзістай сістэмы і вугляводна-тлушчавага абмену. Ужо створаны банк ДНК спартсменаў 20 нацыянальных каманд Беларусі. Пратэсціраваны алімпійская зборная каманда Беларусі па біятлоне, нацыянальныя каманды Беларусі па хакеі, тэнісе, прадстаўнікі нацыянальнай зборнай каманды лёгкаатлетаў (марафон), хакейная каманда мінскага спартыўнага клуба «Дынама».

— Падрыхтоўка атлетаў з улікам іх індывідуальных асаблівасцяў дазваляе дасягнуць высокіх спартыўных вынікаў, захаваўшы здароўе спартсменаў, і павышае эфектыўнасць расходавання дзяржаўных сродкаў, выдаткаваных на спорт, — тлумачыць Валянціна Лемеш.

**Пашпарты ўтрымліваюць інфармацыю аб наяўнасці пэўных генаў, якія абумоўліваюць схільнасць канкрэтнага чалавека да развіцця 19 захворванняў.**

## ПРАГРАМА... ЗДАРОЎЯ

Яшчэ адзін цікавы напрамак працы — стварэнне генетычных пашпартоў здароўя. Такія пашпарты ўтрымліваюць інфармацыю аб наяўнасці пэўных генаў, якія абумоўліваюць схільнасць канкрэтнага чалавека да развіцця 19 захворванняў: ішэмічнай хваробы сэрца, інфаркту міякарда, венозных трамбозаў, дыябету, астэапарозу, бранхіяльнай астмы і алергічных рэакцый, праблем са слыхам і іншых захворванняў.

Гэта асабліва актуальна для тых людзей, сваякі якіх мелі ў анамнезе гэтыя захворванні. Веды аб генетычнай схільнасці да іх дазваляюць ажыццявіць прафілактыку і ранняю дыягностыку паталогій, карэктна вызначыць прагноз развіцця небяспечных ускладненняў і правільна выбіраць метады прафілактыкі і лячэння. Скажам, калі выяўляецца рызыка дыябету, чалавек мяняе дыету.



Можна правесці даследаванне на вызначэнне індывідуальнай адчувальнасці да лекавых прэпаратаў і таксічных рэчываў, зрабіць прагноз эфектыўнасці прымянення лекаў пры лячэнні псіхічных расстройстваў. Вельмі запатрабавана такая паслуга, як устанаўленне генетычнай схільнасці да невыношвання цяжарнасці. Здараецца, што практычна здаровая жанчына не выношвае запар шэсць цяжарнасцяў, а ўрачы нічым не могуць ёй дапамагчы. У лабараторыі выяўляюць генетычныя дэфекты, адказныя за паталогію.

**Ген, які адпуджвае ад бульбы каларадскага жука, выпрацоўваецца толькі ў бацвінні, а ў клубнях, што знаходзяцца ў зямлі без уздзеяння сонечнага святла, гэты ген увогуле адсутнічае.**

## ЭЛІТНЫ БАНК

Рэспубліканскі цэнтр геномных біятэхналогій выйшаў на сваю праектную магутнасць ужо праз два гады пасля ўводу ў эксплуатацыю і працягвае нарошчваць аб'ём паслуг установам Мінсельгасхарча, Міністэрства аховы здароўя, Мінспорту, Мінпрыроды і фізічным асобам. Скажам, калі летась было зроблена больш як 2 тысячы генетычных пашпартоў, то сёлета гэты паказчык ужо перавышаны. Толькі за 9 месяцаў платных паслуг было аказана на агульную суму ў 4,7 мільярда рублёў. А з моманту ўвядзення ў эксплуатацыю цэнтра геномных біятэхналогій заробленa каля 10,5 мільярда рублёў.

Не без падстаў ганарацца ў Інстытуце генетыкі і цыталогіі і Рэспубліканскім банкам ДНК чалавека, жывёлін, раслін і мікраарганізмаў. Сёння ён утрымлівае ўжо больш за 8,6 тысячы ўзораў ДНК. Скажам, банк ДНК раслін і жывёлін можа спатрэбіцца для аховы рэдкіх відаў і захавання біялагічнай разнастайнасці. Тут ёсць узоры ДНК пацыентаў з рознымі захворваннямі, напрыклад са злаякаснымі пухлінамі мачавога пузыра, яечнікаў, пацыентаў з сардэчна-сасудзістымі і іншымі захворваннямі. Банк змяшчае каля 900 ДНК этнічных беларусаў з 6 геаграфічных рэгіёнаў, базу ДНК элітных спартсменаў... Пры тэмпературы мінус 80 градусаў нацыянальнае багацце можа захоўвацца вечна. Але найбольш унікальныя ўзоры плануецца захоўваць пры тэмпературы вадкага азоту...

Дарэчы, у Акадэміі навук ужо ўшчыльную падышлі да стварэння навукова-тэхналагічнага парка «Бел-Біяград». Чакаецца, што на яго базе знойдуць прымяненне такія галіны, як біятэхналогіі, фармацэўтыка, нана- і мікрасістэмная тэхніка. Гэта будзе асаблівая эканамічная зона.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ПАД ПОКРЫВАМ ВЕРЫ І ЛЮБОВІ



**Пакровы. Гэтае свята адзначаецца праваслаўнай царквой штогод: 14 кастрычніка ва ўсіх храмах звіняць званы ў памяць таго дня 910 года, калі над галовамі людзей цудоўным чынам прасцёрся амафор Найсвяцейшай Багародзіцы. Пакроў Божай Маці ахінае нас ад бяды, мацуе ў кожным веру і любоў.**

Адметна, што да гэтага важнага ў рэлігійнай традыцыі свята ў нас прымеркаваны Дзень маці. Тым самым на дзяржаўным узроўні ўмацоўваюцца традыцыйныя сямейныя каштоўнасці і маральныя асновы грамадства.

Раніцай 14 кастрычніка ў мінскім Храме-помніку ў гонар Усіх Святых адбылася літургія з удзелам Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Гэтае ўрачыстае набажэнства сабрала мноства людзей усіх узростаў. Побач са сталымі прыхаджанамі шчырую малітву ўзносілі маладыя маці з немаўлятамі на руках.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**





**На здымках:**
**Падчас урачыстага набажэнства.**
**Мноствам беласнежных кветак упрыгожаны галоўны абраз свята.**
**Мінчанка Надзея Ягорава прыйшла ў храм разам з дачкой Валерыяй.**

■ Акцыя

## ЗАПРАШАЕ «ЧЫСТЫ ЛЕС»

**17 кастрычніка ў краіне па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі чарговы раз пройдзе агульнарэспубліканская акцыя «Чысты лес».**

Нагадаем, што яна прысвечана добраўпарадкаванню і навядзенню парадку ў лясах, каля аўтамабільных і чыгуначных дарог, вакол садоўніцкіх таварыстваў, дачных кааператываў і населеных пунктаў, на пляцоўках адпачынку; ліквідацыі там несанкцыянаваных звалак будаўнічых і бытавых адходаў. Чакаецца, што сёлета ў «Чыстым лесе» возьмуць удзел амаль 30 тысяч чалавек. А агулам за ўсе гады правядзення акцыі ў ёй паўдзельнічалі больш як 60 тысяч добраахвотнікаў. Далучыцца да іх можа любы ахвотны. Для гэтага трэба звярнуцца ў любое лясніцтва і заявіць аб сваім жаданні дапамагчы ў навядзенні парадку ў лесе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск № 17 (40)



Фота Надзеі БУЖАН

# Закон кокана

Мая мама чамусьці ў штыкі ўспрымала ўсіх маіх кавалераў. Заўсёды паўтарала «Любоў зла — палюбіш і казла». Праўда, крыху пазней я, расчараваўшыся ў «самым лепшым, самым разумным, самым прыгожым», у адчаі пагаджалася з ёй і думала: «Вось выйду замуж, нараджу сына і выхаваю некаму цудоўнага мужа — добрага, шчырага, шчодрага, адказнага, самастойнага...» Але мая саманадзейнасць стала менш катэгарычнай пасля таго, як у мяне з'явіўся Цудзік....

Аказалася, што сляпы мацярынскі інстынкт, характэрны ад прыроды большасці жанчын, не абмінуў і мяне. Словамі не перадаць, як я радавалася, калі два гады таму у маёй далоньцы апынуўся маленькі руды камячок, якога былыя гаспадары спрабавалі ўтапіць у рэчцы. Вядома, шкадавала кацяня, песціла, дазваляла яму практычна ўсё... І, як вынік, цяпер, калі Цуд чарговы раз штосьці «ўцудзіць», чую ад мужа, што «выхавала эгаіста». Сапраўды, Цудзік, нягледзячы на ўсе свае станоўчыя якасці, надзвычай нахабны кот. Калі яго зганяеш з паліцы з кветкамі, ён, быццам на зло, праз хвіліну апынаецца там жа і працягвае ласавацца хларафілам. Зусім нядаўна пагрыз мае акуляры. А колькі навушнікаў пацярпела ад яго зубоў, нават збілася з ліку...

Кажуць, мудрасць прыходзіць з гадамі, але мне здаецца, што з разуменнем. Прынамсі я, дзякуючы сітуацыі з Цудзікам, зразумела: колькі ў мяне будзе дзяцей — залежыць ад Бога. А вось якімі яны вырастуць — збольшага ад таго, ці змагу я справіцца са сляпым мацярынскім інстынктам. Бо, не сакрэт, бескантрольная любоў можа вельмі моцна нашкодзіць дзіцяці...

Як нашкодзіла дзядзьку майго знаёмага. Сярожачка з дзяцінства быў «самым лепшым, самым разумным, самым прыгожым». Што б ён ні зрабіў, маці заўсёды знаходзіла сыну апраўданне. Прынёс двойку — настаўніца вінаватая, разбіў суседскае акно — сябры шалапутныя. Нядаўна мне расказалі, што ён, ужо дарослы мужчына, курыў пры маці. Хоць ведаў, што ў яе рак лёгкіх... А тая да апошняга працягвала апраўдваць свайго Сярожачку: ён жа п'яны, нічога не разуме...

Сашу таксама «пашчасціла». Рос без бацькі, таму ўся ўвага маці была скіравана на яго. Яна лепш ведала (і ведае!), што, калі і як рабіць сыну. І вось хлопцу, які вырас у цяплічных умовах, ужо далёка за 30. А ён не можа стварыць сям'ю. Не з-за таго, што не хоча. Проста ніхто не навучыў яго браць адказнасць за сябе, ужо не кажучы пра іншага чалавека. Пры гэтым ён лічыць, што ўсе яму нешта павінны...

І падобных гісторый, калі маці, якім нестае мудрасці, здзьмухваюць парушынкі з дзяцей і тым самым, самі таго не разумеючы, псуюць іх, процьма. А пасля яшчэ здзіўляюцца, чаму жыццё так лёгка ламае і губіць «самых лепшых, самых разумных, самых прыгожых»...

Спрацоўвае закон кокана. Аднойчы чалавек заўважыў, як матылёк спрабуе прабіцца праз маленькую шчыліну на волю. Доўга стаяў і назіраў, а пасля не вытрымаў і вырашыў яму дапамагчы — узяў ножык і разрэзаў кокан. Вядома, матылёк адразу вызваліўся. Але яго цельца было слабым, а крылы празрыстымі і ледзь рухаліся. Чалавек працягваў назіраць, думаючы, што вось-вось крыльцы матылька расправяцца і ён паляціць. Але чаканні не апраўдаліся. Рэшту жыцця матылёк так і цягнуў па зямлі свае нерасправленыя крылы. Ён так і не змог узляцець...

**Надзея ДРЫЛА.**
*dryla@zviazda.by*

■ Тыя, хто побач

# «З НАМІ НЕ ЗАСУМУЕШ!»

**Смачныя бабуліны блінцы, захапленне Сальвадорам Далі і кветкі на тэніс, якія раздаваліся вучням у вучылішчы. Аб гэтым і не толькі распавяла Ксенія Мірная, жонка самага знакамітага беларускага тэнісіста, шчаслівая маці чатырох дзетак.**



«Я заўжды марыла аб вялікай, шчаслівай і дружнай сям'і».

## «Я — НАСТАЎНІК. І ГЭТА МАЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ»

***— Ксенія, як праходзяць вашы амерыканскія будні?***

— А даліся вам гэтыя амерыканскія будні *(смяецца)*. У нас самае актыўнае і цікавае жыццё праходзіць якраз у Беларусі, дзе нашы дзеці таксама ходзяць у дзіцячы садок, школу. У іх ёсць сябры і іншыя мінскія інтарэсы: тэніс, тэатр, гурткі, дадатковыя заняткі...Шмат увагі наша сям'я надае яшчэ аднаму дзецішчу — спартыўнаму цэнтру імя Максіма Мірнага. Безумоўна, пакуль Максім лётае па свеце і ўдзельнічае ў спаборніцтвах, а маё жыццё круціцца вакол нашых дзяцей, асноўную нагрузку па кіраванні цэнтрам усклаў на сябе Мікалай Мікалаевіч, тата Макса, але ён заўжды раіцца з намі, вучыцца сам і вучыць нас, як весці падобны бізнес.

***— За знаёмства з Максімам вы ўдзячны мадэльнаму бізнесу?***

— Мне наогул здаецца, што я ніколі не была ў мадэльным бізнесе. Гэта сам лёс падкінуў мне лесвічку. Я — настаўнік, і гэта мае прызначэнне, прафесія. Але я не хацела абмяжоўваць сябе. Пастаянна імкнулася развівацца і ў другіх напрамках: мастацтва, тэатр, музыка, касметалогія і, нарэшце, свет моды. З'явілася магчымасць бясплатна прайсці курсы ў мадэльным агенцтве. Чаму б і не? Гэта ж цікава — даведацца, як правільна хадзіць, апранацца, фарбавацца. Мяркую, кожны дзяўчыне падобныя ўрокі былі б даспадобы. Не скажу, што я разлічвала на поспех. У 23 гады рэдка пачынаюць кар'еру мадэлі. Проста хацелася паспрабаваць сябе ў гэтай дзейнасці і ў мяне атрымалася. У конкурсе «Твар новага веку» мне прысвоілі тытул «Міс Фота». З'явіліся праекты, пайшла рэклама, паказы моднага адзення. На адным з іх я і сустрэла Макса. Так, за гэта я ўдзячная. Толькі не мадэльнаму бізнесу, а Богу, бо прасіла падказаць мне, хто ён, мой лёс. Ну а калі «апусціцца» на зямлю, хачу падзякаваць Тамары Ганчаровай, гаспадыні мадэльнага агенцтва. Калі яна заўважыла ў Макса сапраўдны інтарэс да мяне, усяляк спрабавала запэўніць яго, што мяне не заваяваць.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***

■ Пераадоленне

# Правілы жыцця ЛІЛЬКІНАГА ТАТЫ

**Маё знаёмства з Лількай і яе татам пачалося з фотаздымка *(глядзіце 5-ю стар. «СГ»)*. Убачылі яго з калегам у інтэрнэце і тут жа па нумары на майцы знайшлі Дзмітрыя Цімашкова ў спісе ўдзельнікаў мінскага паўмарафону. Лількін тата (менавіта так называецца блог, які не першы год вядзе Дзмітрый — www.lilkindad.livejournal.com) быў крануты тым спосабам, якім мы яго адшукалі, і пагадзіўся расказаць сваю гісторыю.**



Фота Надзеі БУЖАН.

**Распачынаем гутарыць на кухні ў кватэры Цімашковых. Васьмігадовая Лілька сядзіць побач у звычайнай дзіцячай калясцы, трымае на каленях сіліконавую форму для выпечкі, запоўненую марожанымі гайкамі. Час ад часу б'е па іх рукой і «ўгукае». «Так мы вучымся адчуваць», — тлумачыць Дзмітрый. — У дзяцей з цяжкай формай ДЦП *(дзіцячага цэрэбральнага паралiча. — Н.Д.)* з гэтым праблема». Падчас размовы Лількін тата некалькі разоў адхіляецца, каб паглядзець, ці зварылася грэчка, паравая гародніна, курыца. «Вось паабедаем, а потым паедзем на Мінскае мора акунацца. Калі хочаце, можаце далучацца». — «Кастрычнік жа, холадна...» — здзіўляюся. — «Нічога, мы загартаваныя. Праўда, Лілія?» — «Уууу».**

**Слухаю іх «тарабарскую» (як кажа Дзмітрый) гаворку і радуюся за Лілю — усім бы такога татку!**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Нататкі таткі



# ЯМЧЭЙ ЗА ЛЮБОЕ ІМЯ

**Супадзенне, але з кола знаёмых нашай сям'і дачка дагэтуль зусім неразборліва вымаўляе толькі адно імя — маміна. Так супала, што ў простым слове «Віка» адразу дзве літары — «в» і «к» пакуль з'яўляюцца для яе сур'ёзнай перашкодай. Жартам жонка часам крыўдуе на такую «несправядлівасць», але ў глыбіні душы яна разумее: з першага Васілісінага слова і на ўсё жыццё Віка будзе для дачкі проста «мама», а гэта — цяплей, ямчэй і глыбей, чым любое імя.**

Напаўненне ў слове «мама» для кожнага чалавека сваё. Сэнс яго прыблізна аднолькавы, але адценні — вельмі розныя. Для мяне, як і для большасці, эталонам тут з'яўляецца мая маці. Разам з бацькам яны нарадзілі і паставілі на ногі 10 дзяцей. Тое, якой цаной гэта ім далося, мы асэнсавалі, толькі калі падраслі. Малым нам было складана зразумець, чаму мама не любіць цукерак. Чаму, калі на стале з'яўляліся якія-небудзь прысмакі, яна заўсёды казала, што ўжо наелася ці пачастуецца потым. У яе атрымлівалася спраўляцца з такой колькасцю дзяцей і весці гаспадарку, бо бацька заўсёды прападаў на працы. Пры гэтым мама амаль ніколі не павышала голас, толькі зрэдку запрашала ў памочніцы цётку крапіву. Сёння кожны з нас скажа, што вырас у любові, але ніхто не можа пахваліцца тым, што ён быў любімчыкам. Маці вучыла нас шчырасці і справядлівасці. Кожны дзень абавязкова зычыла поспехаў перад школай. Калі падрасталі, ніколі не ўмешвалася падчас выбару прафесій. Давала магчымасць самім вызначыцца з будучыняй. Толькі прасіла ўважліва ўсё абдумаць і рэальна ацаніць свае здольнасці. Потым разам з намі хвалявалася і ўпотай прасіла ў Бога падтрымкі. Шчыра радавалася паступленням і хрысціла ўслед, калі прыходзіў час адпраўляцца на вучобу. Яна амаль нідзе не была, але заўсёды гаворыць, што бачыла шмат, бо бачыла галоўнае. Сёння матуля з такой жа пяшчотай працягвае хвалявацца за нас і за нашых дзяцей.

У дзяцінстве мы, напэўна, недастаткова цанілі тое, што давалі нам бацькі, бо былі перакананы: гэта іх абавязак. Мы не ведалі, што больш дае не той, хто забяспечвае ўсім неабходным, а той, хто аддае ўсё. Мы раслі з глыбокім перакананнем, што ўсе мамы і таты — правільныя, але жыццё паказвала іншае.

Аднойчы падчас працы ў раённай газеце мне давялося пабываць на пасяджэнні камісіі, на якой разглядалі справы праблемных сям'яў. На парадак дня было вынесена пытанне пазбаўлення адной «маці» бацькоўскіх правоў у дачыненні траіх яе непаўналетніх дзяцей. Па дакументах яшчэ зусім маладая — да 25, знешне яна выглядала на ўсе 40. Часты госць такіх пасяджэнняў, яна, напэўна, была адзінай, хто адчуваў сябе тут камфортна. Сваімі паводзінамі, кожным словам і жэстам выказвала сваю абыякавасць да таго, што адбываецца. На ўсе ж дакоры камісіі адказвала толькі яхіднай усмешкай. Калі ж старшыня не вытрымаў і нарэшце выдаў: «Марына, мы будзем рыхтаваць паперы, каб пазбавіць цябе бацькоўскіх правоў», яна ўсё з той жа абыякавасцю выдала: «Напужалі. Забірайце! Я сабе яшчэ нараджаю. Буду нараджаць вам на зло!»

Калі расказваў пра гэты выпадак сваёй маці, на яе вачах бліснулі слёзы. Адзінае, што яна прамовіла: «Так не павінна быць, бо кожная жанчына кардынальна мяняецца з нараджэннем дзіцяці»... Гэтыя словы цвёрда зафіксаваліся ў маёй падсвядомасці.

Сёння я з цікавасцю назіраю за тым, як з нараджэннем дачкі змянілася мая Віка. У ёй праяўляюцца тыя рысы, аб якіх я нават не мог здагадвацца. Многія яшчэ да нядаўняга часу прынцыповыя рэчы адышлі на другі план. Кожную сваю хвіліну яна ўдзяляе дачцэ. З уважлівасцю падыходзіць да ўсяго, што звязана з яе выхаваннем і развіццём. Асаблівае месца адводзіць чытанню. Жонка ўзяла за правіла хаця б раз на месяц набываць дачцэ па новай кнізе. На практыцы гэта адбываецца часцей, чаму Васіліса толькі рада. Безумоўна, я таксама імкнуся максімальна ўдзельнічаць у выхаванні, але асноўная нагрузка ляжыць на плячах жонкі. Менавіта дзякуючы яе намаганням Васіліса ў свае год і сем месяцаў вельмі камунікабельная, шмат чаго ўмее рабіць самастойна. Нават з цікавасцю асвойвае літары (якія ўмее называць), казкі ж не проста слухае, але і адказвае на простыя пытанні па іх змесце.

Часам, калі ўвечары гуляем разам з Васілісай у лялькі, тлумачу дачцэ, што яна, як матуля, павінна клапаціцца аб іх. Тады малая адразу пачынае шкадаваць і закалыхваць «дачушак» на руках. Яна ведае, як трэба прыгатаваць для іх «сюп» і даць «піць». Плаксу, калі той пачынае пішчаць, будзе спачатку супакойваць, а потым пагрозіць пальчыкам і скажа: «Цыц!». Калі ж запытаешся ў яе, хто Насціна (так завуць адну з лялек) мама, Васіліса тыркне сабе ў грудзі пальчыкам і вымавіць «Ці». Тут я не ўтрымаюся ад усмешкі, абавязкова з усёй пяшчотай пацалую дачку і моцна абдыму, каб яна адчула любоў, якую праз дзясяткі гадоў будзе дарыць маім унукам.

**Аляксандр АЛЕСІК**

■ Бабуля, пачытай!

## ГРЫБНІКІ

*Нашаму Сярожку*
*Толькі шэсць гадоў,*
*Ды ён поўны кошык*
*Назбіраў грыбоў!*

*Рыжыкі, лісічкі,*
*Сыраежак шмат...*
*Памаглі сястрычкі —*
*Ім удзячны брат.*

*І сабачка Тобік*
*Цёрся каля ног,*
*Як маленькі гномік,*
*Ён спрыяў, як мог.*

**Галіна НІЧЫПАРОВІЧ,**
*в. Магільна,*
*Уздзенскі раён*

■ Мама, адпачні

# МАРСЭЛЬ ПАД ВІЦЕБСКАМ,

## або Новыя прыгоды Шурыка

**Упэўнены, што ў бацькоў часта ўзнікае «галаўны боль» — чым пацешыць дзяцей. Асабліва ў татаў «выхаднога дня» (аўтар гэтых радкоў, праўда, не зусім «выхадны тата», бо і ў іншыя дні бачыцца са сваімі сынамі, забірае іх з гурткоў). Сапраўды, як здзівіць малых, куды пайсці, калі ў лялечны тэатр ім ужо не хочацца, а фільмаў добрых на гэтым тыдні не паказваюць? У кавярню? Сынам проста з'есці марозіва там нецікава. Была б машына, ездзіў бы з імі па старажытных гарадах Беларусі. На жаль, няма. Таму прыходзіцца перыядычна, як той сказаў, ламаць галаву.**



### ПАГОНЯ ЗА ВОСЛІКАМ

Успомніў, што на ўскраіне Віцебска жывуць муж і жонка, якія на сваім падворку трымаюць экзатычных жывёл. У Настассі і Аляксандра Шаўчэнкаў ёсць вярблюдзіца Шэры, паўночны алень Норд, асёл Марсэль, некалькі поні, сярод якіх адзін з самых маленькіх у краіне. А таксама — коні, экзатычныя свінкі... На Шэры, поні, вослiку можна пакатацца. Арганізуюцца таксама і конныя паходы.

Дзіўна, што мала хто з маіх знаёмых ведае пра гэтае прыватнае «царства звяроў». Для такіх паведамляю, што незвычайнае — побач: на праспекце Фрунзэ. Праўда, у пасёлку Тулава, які, дарэчы, уваходзіць у гарадскую мяжу. Туды ходзіць грамадскі транспарт. З вакзала можна даехаць на маршрутцы №94, аўтобусе №7. Прыпынак «Паштовая». Узгаднiць усе нюансы ў ідэале лепш на старонцы «УКантакце» «Центр верховой езды в Витебске. Верховая езда».



Аляксандр Шаўчэнка, калі мы прыехалі, рамантаваў агароджу «пляцоўкі», дзе гуляюць вярблюдзіца і алень. Катанне ж ладзіцца на полі насупраць катэджа гаспадароў. Мой старэйшы сын гадоў пяць таму катаўся на цыркавым вярблюдзе, малодшы — ніколі. Сядзець так высока паміж гарбамі — гэта і для дарослых выпрабаванне. Малыя былі ў прыемным шоку. Экстрым адчуў і тата.

Малому вельмі спадабаўся вослік. Мо яшчэ і таму, што гаспадар даверыў яго пасвіць. Папярэдзіў, каб не падпускаў блізка да маладых коней, бо жывёлы, калі можна так сказаць, не сябруюць. Сын старанна выконваў сваю часовую працу. Пры гэтым нешта гаварыў вушастаму, даваў парады, і, здавалася, што хвастаты яго слухае, як старэйшага брата. Але раптам Марсэль перастаў слухацца. І ролю пастуха прыйшлося выконваць мне. Міжволі ўзгадаў камедыю пра Шурыка, які ўпарта спрабаваў «завесці» асла. Мы з сынам, як маглі, выконвалі заданне Аляксандра. Але ж... Нешта Марсэлю не спадабалася, і ён пабег. Думаеце, аслы — ціхаходныя жывёлы? Куды там! Выбег на дарогу і памчаў так, што спакойна мог абагнаць аўто. Малы ўслед за ім. Здзівіў Марсэль тым, што яго забег скончыўся акурат ля павароту да катэджа гаспадароў. Ён рэзка спыніўся і паціху вярнуўся ў двор. Саша пажартаваў, што з асаблівa важным заданнем мы не справіліся, але даверыў зноў сачыць за наравістым Марсэлем.

### А ХТО ТАКІ ВАЗІЛА?

У прыватным цэнтры верхавой язды можна навучыцца катацца на конях. Прычым прапануюць урокі як індывідуальныя, так і для ўсёй сям'і. Праводзяць конныя прагулкі і паходы. Ёсць праграма для навічкоў і тых, хто даўно не ездзіў, а таксама для вопытных наезнікаў. Кошт залежыць ад працягласці катання.

Нярэдка сюды прыязджаюць хлопчыкі і дзяўчаткі з дзіцячым цэрэбральным паралічам. Даказана, што катанне на конях для іх вельмі карыснае. Як і для здаровых людзей. Ёсць даследаванні пра тое, што падчас прагулачнай верхавой язды чалавек траціць да 345 калорый за гадзіну (у залежнасці ад вагі наезніка. — **Аўт.**), 690 калорый, калі конь скача галопам.

— Верхавая язда насамрэч вельмі карысная для здароўя. Яна паляпшае каардынацыю, фізічны і псіхалагічны стан, паставу... Аднязначна конныя прагулкі спрыяюць добраму настрою як у працэсе, так і потым, — распавядае Настасся Шаўчэнка.

Безумоўна, перад знаёмствам з коньмі хочацца іх нечым пачаставаць.

— Паўкіло добра вымытай морквы, спелыя салодкія яблыкі будуць цудоўным падарункам для коней. Прычым моркву сярэдніх памераў не трэба рэзаць — у іх жа добрыя зубы. А яшчэ жывёлам падабаюцца сухары. А вось хлеб і булкі не рэкамендуюцца, бо могуць выклікаць колікі. Можна прынесці цэлы кавун або проста кавуновыя скарынкі. Іх коні вельмі любяць! Цукар не ўсім можна, і ўжо дакладна не карысна. І на капусту табу, як і на арэхі, садавіну з костачкамі, дыню... Збіраючыся пачаставаць незнаёмага каня, абавязкова спытаецеся дазволу ў яго гаспадара (трэнера), — тлумачыць Настасся.

У планах Шаўчэнкаў — стварэнне сямейнай сядзібы Дзеда Мароза. Акрамя таго, што ёсць алень, дык і сані Аляксандр робіць. Ён жа мае добры вопыт працы галоўным навагоднім казачным персанажам. У гаражы, дарэчы, ёсць і карэты. Такім чынам, круглы год можна катацца не толькі вярхом.



Выява Вазілы.

На развітанне нам паказалі выяву Вазілы. Гэта дух-заступнік коней. Паводле паданняў беларусаў, ён выглядае як чалавек, але з конскімі вушамі і капытамі. Вазіла жыве на стайні, усяляк клапоціцца пра коней, беражэ іх ад хвароб, а калі яны на пашы, у табуне — ад драпежных звяроў.

Раю ўзяць з сабой у прыватны «заапарк» фотаапарат. А лепш папрасіце знаёмага фатографа за невялікую плату зрабіць прафесійныя здымкі. Яны, несумненна, упрыгожаць фотаальбом вашых дзяцей.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Віцебск — Віцебскі раён*

■ Цяжкія пытанні

# ТРЭНІНГ ДЛЯ ДУШЫ

## У Маскоўскім раёне сталіцы запусцілі бясплатныя курсы падтрымкі сем'яў і падлеткаў

**Мы прывыклі, што тэрытарыяльныя цэнтры сацабслугоўвання насельніцтва актыўна займаюцца з пажылымі людзьмі. Ладзяць для іх гурткі самадзейнасці, праводзяць заняткі па ёзе, навучаюць замежным мовам. Але на падтрымку ў мясцовых цэнтрах могуць разлічваць не толькі пенсіянеры. Псіхолагі ТЦСАНа Маскоўскага раёна горада Мінска вырашылі запусціць бясплатныя трэнінгі для падлеткаў і маладых пар, каб дапамагчы тым справіцца з праблемамі, што ўзнікаюць штодня. Спецыялісты не баяцца, што курсы прыбавяць ім працы. Наадварот, самі ходзяць па школах і ў ЗАГС, каб запрасіць у групы зацікаўленых.**



Каманда псіхолагаў, якая вядзе курсы.

— Мне здаецца, калі людзі ідуць працаваць у сацыяльную сферу — гэта ўжо дыягназ, — жартуе **псіхолаг ТЦСАНа Маскоўскага раёна Святлана МАЦУЛЕВІЧ.** — Ты першапачаткова накіраваны на дапамогу і ў нейкай ступені альтруістычнасць, жадаеш штосьці змяніць. Запусцілі курсы і таму, што самі хочам развівацца, нам цікава апрацаваць новыя методыкі.

Сённяшнюю запатрабаванасць псіхолагаў спецыялісты тлумачаць тымі ўмовамі, у якіх мы жывём. Калі ў савецкія часы чалавек пераважна разглядаўся як частка грамадства, то цяпер робіцца факусіроўка на асобе. Некалі і сам лад жыцця быў іншы: за фізічнай працай не было часу на эмацыйныя праблемы.

Адна з задум псіхолагаў тэрытарыяльнага цэнтра — праводзіць сустрэчы сямейнага клуба, дзе будуць абмяркоўваца асабістыя, дзіцяча-бацькоўскія тэмы. І справа не ў тым, што ў сённяшніх сужэнцаў праблем больш. Паводле слоў спецыялістаў, раней сямейнаму інстытуту была ўласціва стрыманасць. Калі ты ажаніўся, то гэта на ўсё жыццё. І людзі ў сітуацыі, у нейкай ступені, безвыходнасці, больш паблажліва пачыналі ставіцца да недахопаў другой паловы, мірыліся з імі. Цяпер лічыцца, што ўсё можна памяняць. І сужэнца ў тым ліку. Не сышліся характарамі — развяліся. Але непаразуменні будуць з'яўляцца, бо жаночая псіхалогія дыяметральна супрацьлеглая мужчынскай.

— Трэба не ўскладаць надзеі, а канкрэтна расстаўляць кропкі над і, — раіць **загадчык аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі Анастасія САРАГАВЕЦ.**

— Шлюб — гэта поўнае пазнаванне чалавека, — дадае Святлана. — Толькі пасля вяселля людзі цалкам раскрываюцца. Да шлюбу яшчэ вядзецца гульня, мужчына і жанчына спрабуюць заарканіць адно аднаго.

— Беларуская статыстыка ўжо каторы год сведчыць аб вялікай колькасці разводаў. Можа і добра, што людзі, не знайшоўшы паразумення, разыходзяцца? — пытаю ў Святланы.

— Не думаю. Хаця б таму, што калі бацькі разводзяцца, траўмуюцца дзеці. За выключэннем асобных выпадкаў (калі, напрыклад, у сям'і ёсць месца гвалту), я за захаванне шлюбу. Тым больш у многіх сітуацыях гэта магчыма. Перашкаджае нежаданне працаваць над адносінамі.

Для падлеткаў у тэрытарыяльным цэнтры адкрываюць групу псіхалагічнай падтрымкі «Цяжкія пытанні». На сустрэчах, што будуць праходзіць у фармаце дыскусій і трэнінгаў, школьнікам падкажуць, як лепш з улікам іх здольнасцяў арганізаваць навучанне і вольны час, як не паддацца дэпрэсіі ў няпростых сітуацыях. Паводзіны дзяцей у падлеткавым узросце, тлумачаць псіхолагі, з большага абумоўлены не характарам, а ўзроставымі зменамі. Раздражняльныя школьнікаў робяць гармоны. Бацькам у гэты перыяд не варта пастаянна крытыкаваць падлеткаў. Лепш паклапаціцца, каб быў надзейным асяродак, дзе дзіця праводзіць свой час.

— Як працаваць з падлеткамі? Іх трэба навучаць па прынцыпе роўны роўнаму. Гэта самы дзейсны метад узаемадзеяння з дзецьмі ў такім узросце. І ў нашага псіхолага Кацярыны гэта добра атрымліваецца. Яна ходзіць цяпер па бацькоўскіх сходах, набірае групу, — расказвае Анастасія Сарагавец.

Яшчэ адзін цікавы курс, які вырашылі запусціць у ТЦСАНе, называецца «Мастацтва быць жанчынай». І, паверце, ён не пра тое, як правільна варыць баршчы і сустракаць мужа ўвечары.

— Нагадваем жанчынам, што трэба любіць сябе, — расказвае пра курсы Святлана. — У сучасных жанчын шмат абавязкаў, такая напруга, што пра сябе часам забываюць. Хацелася б адцягнуць увагу ад гэтага рэжыму нон-стоп.

Падобныя платныя трэнінгі (дзень заняткаў ад вядомых гуру можа абысціся больш за 100 долараў!), трэба сказаць, карыстаюцца папулярнасцю. Чаму? «У нас мужчын менш за жанчын, а кахання і шчасця хочацца кожнай, — усміхаецца Святлана. — Цяпер прыходзіш у любы рэстаран і бачыш, наколькі нашы дзяўчаты яркія. На гэтым фоне складана вылучацца. Нават прыгожыя і цікавыя жанчыны могуць адчуваць сябе няўпэўнена».

Спецыялісты тэрытарыяльнага цэнтра кажуць, што цурацца псіхолагаў і думаць, што іх паслугі толькі для хворых, — глупства. Стрэсы, выгаранні, унутрысабасныя канфлікты бываюць у кожнага. Калі праблемы не прапрацоўваць, узнікае незадаволенасць, азлобленасць. Але ў сілах псіхолагаў змяніць гэты негатыўны настрой.

*Звязацца са спецыялістамі і запісацца на курсы можна па тэлефоне 8(017) 372-25-36.*

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Парады псіхолага



**На пытанні чытачоў адказвае Кацярына ШАВЯЛЁВА, перынатальны псіхолаг, кансультант па родах, магістр сацыяльных навук, аўтар шматлікіх артыкулаў па псіхалогіі і маці траіх дзяцей.**

### ЗГУБЛЕНЫ ТЭЛЕФОН

***Мой сын (яму 10 гадоў) пастаянна губляе мабільныя тэлефоны. На мінулым тыдні — ужо пяты апарат... Я не магу зразумець, чаму так адбываецца. Падаецца, і вучыцца ён добра, і слухаецца з большага, але такі несабраны! Як з гэтым справіцца?***

***Тацццяна, 34 гады, Магілёў.***

Калі гэта не рыса характару, якая праяўлялася і раней, тады прычына ва ўзросце — акурат пубертат. Калі дзіця толькі ўваходзіць у падлеткавы ўзрост, у яго назіраецца рассеянасць псіхічных працэсаў. Арганізм усе намаганні накіроўвае на фізічны рост, гарманальныя змены. Дзіця становіцца няўважлівым, неарганізаваным: уляцела ў адно вуха — з іншага вылецела. Можа з'явіцца зніжэнне працаздольнасці, уважлівасці, сабранасці. Гэта праяўляецца і падчас заняткаў у школе, калі вучань ці вучаніца не слухаюць настаўнікаў, а глядзяць у акно. Такая ўзроставая асаблівасць сама карэктуецца да гадоў 16-17.

Калі рассеянасць у дзіцяці была і раней, тады гэта ўжо рыса характару. Мама, ведаючы, што хлопец такі па жыцці, адпаведна павінна выбудоўваць свае і дзіцячыя паводзіны. Напрыклад, набываць недарагія тэлефоны. А для хлопчыка вельмі важна, каб яму пры размове глядзелі ў твар, каб наладзіўся візуальны кантакт. Інакш можна даваць гарантыю, што інфармацыя не ўспрымецца.

Калі гаворка ідзе пра рысу характару, то значыць, што яна аднекуль узялася. Дакладней, спісалася. Магчыма, з тых жа бацькоў. Бо часам мы жучым дзіця за тое ж самае, што робім самі. Але калі мама і тата гіпераргінізаваныя, а дзіця рассеянае, значыць праблема ў бацькоўскім выхаванні. Бо дарослыя ўзялі на сябе ўсю адказнасць, і ў малога развіваецца так званая «навучаная бездапаможнасць», бо ён прывык, што калі побач бацькі, яны ўсё робяць замест яго.

**Калі ў вашай сям'і ўзнікла складаная сітуацыя і вы не можаце разабрацца самастойна — спытайце парады ў спецыяліста. Свае пытанні дасылайце на электронную пошту pustavit@zviazda.by ці на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, «Звязда»**

■ Вазьму твой боль...

# КАМУ БАЛІЦЬ ПАДМАН





**Я атрымліваю на электронную пошту чарговы ліст ад незнаёмца. Чарговую просьбу дапамагчы. Мальбу дапамагчы. Учытваюся і разумею, што ўжо бачыла гэты тэкст. Некалькі разоў чытала яго, слова ў слова скапіяваны іншымі «гаротнікамі». Жонка-інвалід, дзяцей шмат, вакол вайна, у дачкі знайшлі рак, а ён адзін усіх цягне, рызыкуючы жыццём на шахце. Як такога не пашкадуеш? І мне шкада. Шкада людзей, якім злыя намеры дазваляюць прымераць ролю няшчаснага.**

Добра памятаю сваё першае сутыкненне з махляром у дабрачыннасці. Я тады перажывала крызіс валанцёрства, адчувала прафесійнае выгаранне ва ўсіх яго праявах, востра пераносіла страту падапечных і ў чарговы раз збіралася кідаць дапамогу анкахворым.

І тут ён, добры дзядзечка з інтэрнэту: «Я ўмею раскручваць групы, ведаю метады, магу арганізаваць, мы зборам кучу грошай! Ты дасі гісторыі, я зраблю астатняе. А заробак... падзелім». Я некалькі разоў перачытвала яго паведамленне, не даючы веры ўласным вачам. Мне, наіўнай, ніколі ў галаву не прыходзіла, што цяжка хворых дзяцей можна падмануць і абрабаваць. Не магла нават уявіць, што такое можа прыйсці ў нечую іншую галаву.

Калі шок прайшоў, я заплакала. Бо адчувала, як той план паганіць памяць маіх сяброў, тых, каго працягвала аплакваць і не хацела адпускаць. Мярзотная прапанова звінела ў вушах і білася аб усмешкі тых, каго я яшчэ планавала выратаваць.

У той момант я адчула бездапаможнасць сваёй ідэі, яе крохкасць і неабароненасць. Я раптам зразумела, што яна не застрахавана ад брыдкасці. Любы, абсалютна чужы і незнаёмы, можа рабіць з ёй любыя вычварэнствы.

Пасля я часта чула развагі пра натуральны адбор больш моцных і жывучых, пра «адкіды грамадства» і пра тое, што «грошы патрэбны жывым». І кожны раз словы адгукаліся ўва мне болем.

Мы шмат разоў бачылі гісторыі сваіх падапечных на іншых сайтах. З іх фотаздымкамі, дыягназамі і нават дакументамі, але з іншымі лічбамі ў рэквізітах. Хто правярае гэтыя лічбы? І кожны раз замест абурэння і нянавісці я адчувала боль. Боль за тое дзіця, няшчасце якога стала сродкам заробку для іншых.

Памятаю, як вывучала інтэрнэт-старонку адной «матулі». Яна рассылала жаласныя лісты ў сацсетках. Гісторыя прыблізна такая ж: вакол вайна, мужа забілі, дзіця хварэе, спім на вакзале, на лекі не хапае. Ёй верылі, бо ў наяўнасці быў дакумент — калькуляцыя з анкалагічнай клінікі, дзе прапісаны пратакол лячэння і неабходная сума.

Я адразу пазнала той дакумент. Бо некалькі гадзін правяла з ім у руках, атрымаўшы дрэнныя навіны ад падапечнага «Клуба 5000». Я бачыла на фота складкі на паперы, што засталіся ад маіх рук. Памятала ўсе пераносы слоў і афармленне абзацаў. Заўважыла цень сваіх рук, калі фатаграфавала аркуш. Гэта я размясціла яго ў інтэрнэце з заклікам дапамагчы падапечнаму «Клуба 5000». А змяніць імя на электронным дакуменце зусім нескладана.

Далей я адкрыла альбом з фотаздымкамі яе хворай «дачушкі». І зноў заплакала. Маленькая дзяўчынка ў бальнічнай палаце. Усё прадумана: на фота малеча аднаго ўзросту, паўсюль з лысенькай галоўкай, з вялізнымі сумнымі вачыма. Але ў адным пракалолася махлярка — гэта розныя дзяўчынкі. Я ведаю іх усіх, бачыла ў палатах і ніколі не перабытаю. А для далёкай махляркі яны аднолькавыя, быццам адно і тое ж дзяўчо.

Каб такіх «бацькоў і валанцёраў» станавілася менш і мы дапамагалі сапраўды тым, каму не абысціся без нас, падзялюся назапашанымі за час работы спосабамі распазнання.

**1. Актыўнасць.** Калі гэта група ці старонка ў сацыяльнай сетцы, там увесь час павінна абнаўляцца інфармацыя: свежыя паступленні ахвяраванняў, справаздачы пра выдаткі, стан здароўя, навіны ад бацькоў, медыкаў... Паверце, весці такую групу — вялікая праца. А махляры звычайна шукаюць лёгкі хлеб.

**2. Камунікабельнасць.** Добра вывучайце інфармацыю, выпісвайце для сябе тое, што незразумела, патрабуе ўдакладнення, чаго не хапае. І смела звязвайцеся з адміністратарамі, валанцёрамі, бацькамі. Заўсёды можна ўдакладніць, у якой бальніцы, аддзяленні, палаце ляжыць дзіця, які стан яго сёння, што есць, чым займаецца, якія лекі прымае. Махляр разгубіцца нават ад простых пытанняў і будзе адказваць недарэчна.

**3. Акрамя грошай.** У сапраўдных дабрачынных суполках аб'яўляюць збор не толькі на грошы, але і на адзенне, канцтавары, цацкі, падгузкі, лекі і нават прадукты харчавання. Валанцёры з задавальненнем звядуць вас з сям'ёй і дадуць магчымасць аказваць дапамогу без пасярэднікаў, а махляроў не цікавяць паношаныя боцікі і замарожаная мяса.

**4. Маркіроўка.** Амаль усе дабрачынныя групы цяпер маркіруюць фотаздымкі і дакументы лінкам (інтэрнэт-адрасам) сваёй старонкі, сайта. Сачыце, каб надпіс у адрасным радку супадаў з надпісам на фотаздымку (дакуменце).

**5. Рэквізіты.** Самы зручны лаз для махляроў — інтэрнэт-кашалькі. Іх лёгка завесці і лёгка падмяніць. Тое самае — нумары банкаўскіх картак і тэлефонаў для збору сродкаў. Але ў тых, хто атрымлівае лячэнне ў Беларусі (рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў нашай краіны) ёсць магчымасць завесці дабрачынныя рахунак. Гэта асаблівы від рахунку, які адкрываецца на імя аднаго з бацькоў і толькі пры наяўнасці медыцынскіх дакументаў. Не паляніцеся дайсці да аддзялення банка і пералічыць дапамогу менавіта на такі рахунак. Рабіце ахвяраванні на электронны кашалёк толькі пры ўмове, што ведаеце яго ўладальніка.

**6. Знаёмы пасярэднік.** Дапамагайце праз арганізацыі, дабрачынныя рухі, валанцёраў, а не ў рукі незнаёмых адзіночак. Калі вы ўжо аднойчы перадавалі ляльку для Каці праз гэтага чалавека, а потым убачылі яго адміністратарам у групе дапамогі хвораму Антону, вы паверыце яму і можаце смела перавесці грошы адрасату.

З часоў майго знаёмства з махлярамі шмат вады выцекла. Больш няма той наіўнай, якая плакала ад іх непрыстойных прапаноў. За гэты час я атрымала вялікі досвед валанцёрскай працы, вывучыла «кухню», нажыла імунітэт. Але мне па-ранейшаму балюча сустракаць «чорных дабрачынцаў». Цяпер хвалююся не за тых, чыімі гісторыямі яны несумленна карыстаюцца. Не, свядомасць дапамогу адмежавала падапечных ад злачынцаў. У маёй галаве яны жывуць у іншых сусветах і ніколі не перасякаюцца. А сэрца баліць за самых махляроў. Як жыць, аднойчы назваўшы сваю жонку (няхай сабе і неіснуючую) інвалідам, дачку — смяротна хворай, работу — неаплачваемай? Словы матэрыяльныя. Калі-небудзь у яго будзе і жонка, і дзеці. Дасць Бог, здаровыя.

**Тацццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

# «З НАМІ НЕ ЗАСУМУЕШ!»


«Сувораўскае вучылішча – мая любоў на ўсё жыццё».

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Маўляў, яна вельмі сур'ёзная і занятая, каб з ёй фліртаваць. Праўда, я тады сапраўды была занятая: вучылася ва ўніверсітэце, які пасля скончыла з чырвоным дыпломам, выкладала маляванне ў адной са сталічных гімназій, іграла ў аркестры народных інструментаў (скончыла музычную школу па класе домры), у кампаніі «Мэры Кэй» падпрацоўвала кансультантам па прыгажосці. Часам задумваюся, як усё гэта паспявала? Макс, напэўна, таксама так думаў і прапанаваў сябраваць — без умоў, без прэтэнзій, неяк чыста, прыгожа і па-добраму.

**«Мой любімы мастак Валянцін Сяроў, майстар, які ўзвёў звычайны накід у ранг твораў мастацтва. З сучаснікаў мне падабаецца Вікторыя Кірдзій».**

***— Стасункі з тэнісістам, напэўна, зрабілі з вас сапраўднага спартыўнага заўзятара?***

— Яшчэ якога! Перажывала за яго падчас усіх матчаў. Асабліва, калі гуляў за Беларусь у розыгрышы Кубка Дэвіса. Калі матчы праходзілі ў Мінску, я прасіла сяброў, калег па працы прыйсці, падтрымаць, «пахварэць», раздавала квіткі сваім вучням, а пасля зрывала голас: «Макс, давай! Наперад, я разам з табой!» Скакала ад радасці, калі перамагаў, шкадавала, калі мокры і стомлены пакідаў корт. Усё было! Пра сам тэніс я даведалася ад Максіма і яго бацькі, які цярпліва тлумачыў мне тое, што трэба ведаць і ў чым неабходна разбірацца. Дарэчы, спортам я захаплялася яшчэ да знаёмства з Максам: займалася фітнесам. Была нават такая тэлевізійная перадача, дзе разам з другімі дзяўчатамі мы паказвалі комплекс практыкаванняў. Але ж гэта ўсё балаўство ў параўнанні з тэнісам, з якім мне давялося пазнаёміцца.

***— Некаторыя сваякі спартсменаў ад хвалявання выключаюць тэлевізар, не глядзяць спаборніцтвы. А вы пастаянна сочыце за матчамі Максіма? Хто ў доме галоўны заўзятар?***

— Дзеці! Яны актыўна «хварэюць» за тату. А я крыху паастыла ў сваіх эмоцыях. Безумоўна, хачу, каб ён і надалей перамагаў. Праўда, у той жа час думаю аб тым, каб ён больш часу праводзіў дома, быў здаровы... Але я ніколі не забудуся, калі Макс у пары з Вікай Азаранкай перамог на Алімпіядзе ў Лондане, і мы з дзецьмі шчаслівыя сталі перад тэлевізарам, глядзелі, як беларускі сцяг узвышаецца над астатнімі. Пасля ўручэння залатога медаля, дзеці павыскоквалі ў двор, пачалі танцаваць і крычаць: «Ура! Тата перамог! Бе-ла-русь! Ура-а-а-а!».

***— Дарэчы, ці часта бавіце час разам з сем'ямі іншых тэнісістаў?***

— Сем'ямі мы сустракаемся толькі тады, калі прыязджаем на турніры. Дзеці гуляюць, а мы, мамы, можам пагутарыць. Пэўны час сябравалі з сям'ёй Роджэра Федэрэра, іх пара старэйшая за нашу на паўгода. Неяк нават гасцілі ў іх доме ў Швейцарыі. Пакуль Макс з Роджэрам трэніраваліся, мы з яго жонкай абменьваліся кулінарным досведам. Я навучыла Мірку гатаваць боршч, сырнікі, а яна мяне — пасту і фруктовыя кактэйлі. У іх, як і ў нас, чацвёра дзетак — 2 дзяўчынкі і 2 хлопчыкі.

## «ДОМА СВЯТА, КАЛІ МАКС ВЯРТАЕЦЦА СА СПАБОРНІЦТВАЎ»

***— Сына Дзяміда вы назвалі ў гонар прадзеда Максіма. А ў гонар каго вы далі імёны Меланії, Петры і Трафіму?***

— Меланія... Мы доўга шукалі імя для першага дзіцяці. Мне хацелася, каб яно было прыгожым і абавязкова праваслаўным. Усе імёны, што прапаноўваліся ў сям'і, па нейкіх прычынах кагосьці не задавальнялі. А нам хацелася, каб яно было мілым сэрцу кожнага. Макс мяне называе мілай. Пачалі прымяраць Мілана, Міла, аднак усё роўна было нешта не тое. Імя хоць і прыгожае, але не нашае. Аднак у царкве нам аднойчы падказалі, што ёсць праваслаўнае імя Меланія. І гэта было для нас сапраўдным адкрыццём! На той час маім любімым літаратурным персанажам была Мелані з рамана «Знесеныя ветрам» Маргарэт Мітчэл. Вось тут пазл і сышоўся.

Імя Петра чамусьці некаторым здаецца дзіўным. Нават пытаюцца, дзе мы такое знайшлі? А ўсё насамрэч вельмі проста. Мой дзядуля быў Пятром, у сям'і Максіма таксама былі мужчыны з гэтым імем і па матчынай лініі, і па бацькавай. Добрае імя. Толькі ў нас яно гучыць крыху на замежны лад, бо ў нашай традыцыі не мае жаночага канчатку, але мы знайшлі яго ў царкоўным календары і з благаслаўлення духоўнага айца ахрысцілі дачку Патроніяй. Зрэшты, нікто ж цяпер не здзіўляецца, калі дзяўчынак называюць Аляксандрай, Валерыяй, а калісьці гэтыя імёны былі выключна мужчынскімі. Дома дачушку ласкава называем Пятрушай. Дзякуючы цвёрдаму імя, у яе моцны характар. Я нават сказала б, што ён спартыўны, аднак у той жа час яна ласкавая, трапяткая і шчодрая дзяўчынка.

Так, Трафім Максімавіч... Была ў Макса прабабця Ксенія Трафімаўна. Вось у гонар яе таты яго і назвалі. Ніхто, праўда, не памятае, якім чалавекам быў той Трафім, але, мяркуем, добрым, а калі не, дык у нашага Трафімушкі ёсць шанц даць гэтаму радавому імя новы подых. У перакладзе на англійскую мову яно гучыць як трафей. Таму ён проста абавязаны старацца быць годным чалавекам.

***— На якіх сямейных святах вы стараецеся за сталом сабраць усю сям'ю?***

— Сямейнае свята для нас — гэта калі Макс вяртаецца дадому. Тады ўсе збіраюцца за вялікім сталом, на якім шмат розных прысмакаў і любімых страў. Дзеці звычайна просяць прыгатаваць плоў альбо дранікі. На традыцыйныя святы Мялашка і Дзямідка «замаўляюць» мой салат «аліўе з сакрэтам», а на дэсерт мы разам майструем пірожнае «бульбачку». Дзядуля Мікалай у нас недасяжны майстар па піражках. Мы таксама любім ягоныя шашлыкі. Бабулі балуюць нас бліншамі. Мая маці — пышнымі аладкамі на дражджах, а маці Макса — хрусткімі макароннымі аладкамі, якія ён любіць з самага дзяцінства. У доме адразу робіцца шумна і весела. Пасля Макс дастае прыхаваныя падарункі-сувеніры, прывезеныя з розных краін, трафеі. Ну а дзеці закідваюць тату сваімі вырабамі і малюнкамі. Наступны дзень у нас спартыўна-забаўляльны. Дзеці любяць гуляць у футбол разам з татам і дзядулем. Прычым дзяўчаты не адстаюць ад «хлопчыкаў». Бабуля Таня, маці Максіма, — таксама вельмі спартыўная — садзіцца на шпагат, стаіць на галаве, а таму дзеці пастаянна робяць «колы» і ходзяць на руках. Макс часта прыдумвае розныя весёлыя і цікавыя практыкаванні. Мы таксама любім усёй сям'ёй катацца на роварах. Адным словам, з намі не засумуеш. Я толькі і паспяваю ўсё фіксаваць на камеру.


«Макс пастаянна прыдумвае розныя вясёлыя і цікавыя практыкаванні».

***— Якія кнігі чытаеце ім перад сном?***

— Літаральна на днях зачытвала дзецям цікавыя ўрыўкі з дарослай кнігі Паўла Санаева «Пахавайце мяне за плінтусам». Пра тое, як хлопчык чакаў маці і як марыў аб магнітафоне. Дзеці цяпер растуць дапытлівыя і здольныя разумець часам больш, чым мы думаем. Безумоўна, такія рэчы трэба чытаць з перыядычным тлумачэннем і асаблівай інтанацыяй. Мяламша вельмі зацікавілася, прасіла не спыняцца. Дзямід таксама паплакаў некалькі разоў, а Петра спрабавала зразумець, чаму хлопчык так хацеў магнітафон. Дзяўчаты, безумоўна, чытаюць самі. У Петры зараз любімая кніга англамоўная «How to be the best everything» («Як быць лепшай ва ўсім»), аднак любіць чытаць і на рускай мове. Меланіі падабаюцца кнігі пра падарожжы. Любіць казкі, прычым кожны раз захапляецца тым, як іх шмат у нашай культуры. Пры гэтым сястрычкі заўжды будуць з асалодай слухаць, калі я альбо тата чытаем Дзяміду, які ў захапленні ад розных пазнавальных кніг і энцыклапедый. Яго цікавіць увесь свет: дзе жыве Бог, як уладкаваны чалавек, якімі былі дыназаўры. Ён наогул любіць пафіласофстваваць. Я абажаю падобныя хвіліны.

## «НЕЯК РАЗМАЛЯВАЛА ЛЕСВІЧНУЮ ПЛЯЦОЎКУ ГЕРОЯМІ МУЛЬТФІЛЬМАЎ, І ІХ НЕ ЗАФАРБАВАЛІ»

***— Ксенія, вы неяк сказалі, што сцены вашага дома ўпрыгожваюць вашы мастацкія працы. Адкуль такі творчы інтарэс?***

— Свае мастацкія здольнасці я атрымала ў спадчыну ад бацькі. Я і цяпер памятаю, як ён падпісваў прачытаныя кнігі сваім каліграфічным аўтографам і маляваў сябе ў выглядзе мушкецёра. Мяне гэта захапляла. А мае задаткі выявіліся толькі ў педагагічным каледжы, калі выкладчык па методыцы малявання Васіль Сцежкін звярнуў увагу на характар маіх прац і не толькі настаяў развіваць здольнасці, але і паспрабаваць паступіць у педагагічны ўніверсітэт на факультэт пачатковых класаў і выяўленчага мастацтва. На завочнае не прайшла — не хапіла аднаго бала. Са мной паступалі хлопцы і дзяўчаты з мастацкіх школ, на фоне якіх я была дылетантам. Маці верыла ў мяне і хацела, каб паспрабавала яшчэ раз. У выніку я паступіла на дзённае аддзяленне. Там мне пашанцавала вучыцца ў таленавітага мастака і выкладчыка Віктара Данілава. Ён цудоўны чалавек. Мы вельмі любілі яго пленэры. Колькі пейзажаў мы намалявалі, колькі замкаў і палёў абышлі! Ён улюбіў нас у прыроду Беларусі! Гэтым летам я пазнаёміла з ім сваіх дзетак. Яны ў захапленні і просяцца да яго на ўрокі. Што я люблю маляваць? Нейкі час «бамбіла» ў стылі «гумарыстычны арт». Падсадзіў мяне на яго бацька Максіма. Прывёў на выставу мастакоў, паказаў стыль, які яму больш за ўсё падабаецца, і азадачыў: «А табе слабо?» Ну я і завялася. У стылі Уладзіміра Стэльмахава ў нашай кватэры шмат прац. Аднойчы я размалявала нашу лесвічную пляцоўку персанажамі савецкіх мультфільмаў, і іх гадоў 10 ужо ніхто не замалёўвае. Пасля мяне накрыў Сальвадор Далі. Капіравала яго для сябе і сяброў. У яго працах мне спадабаліся яркія фарбы і філасофія. Аднак найбольш мне падабаюцца партрэты алоўкам. Малявала акцёраў, Максіма, бацькоў, сяброў.

Мой любімы мастак Валянцін Сяроў, майстар, які ўзвёў звычайны накід у ранг твораў мастацтва. З сучаснікаў мне падабаецца Вікторыя Кірдзій. Я вельмі люблю дарыць паштоўкі з яе творамі, насычанымі сэнсам.

***— 6 гадоў, якія вы адпрацавалі ў сувораўскім вучылішчы выкладчыкам, напэўна, пакінулі шмат успамінаў?***

— Сувораўскае вучылішча — мая любоў на ўсё жыццё. Калі сыходзіла адтуль, плакала. Там я адбылася як выкладчык, як псіхолаг, нават як сцэнарыст, касцюмер і рэжысёр. Мы з кадэтамі паставілі тры спектаклі. Прычым шмат касцюмаў да іх рабілі самі. Са скрынак стварылі дэкарацыі. Памятаю, як гарэлі ў хлопцаў вочы, як яны перажывалі, каб усё атрымалася. Як я захаплялася выкладчыкамі нашай кафедры. Дзякуючы маім калегам у мяне склалася мадэль сямейных узаемаадносінаў. Я шмат чаму навучылася ў гэтых сценах, якія, на дзіва, і сёння ўпрыгожваюць працы, зробленыя маімі вучнямі. Я сачу за лёсамі многіх хлопцаў. Кантактую з іх жонкамі, ведаю, як завуць іх дзетак. Яны дзеляцца са мной сваімі думкамі, горам і радасцю. Сёлета я была на сустрэчы з першым сваім выпускам. 15 гадоў прайшло, як яны скончылі вучылішча. За гэты час столькі ўсяго змянілася. Сваё працоўнае месца паказала і сваім дзецям. Было невымоўна чулліва.

***— Кожны год вы праводзіце пэўны час у ЗША. Ці хутка адаптаваліся да заакіянскага жыцця?***

— Упершыню прыляцела ў Амерыку ў 2001 годзе. Максу тады споўнілася 24 гады, і мы адзначылі дзень народзінаў непасрэдна ў самалёце. Ён запрасіў мяне на месяц, а пасля прылятала на зімовыя канікулы, на летнія, а потым ён папрасіў мяне звольніцца з працы і забраў замуж. Адаптавалася я паступова. Спачатку да клімату (у Фларыдзе надта вільготна і горача), пасля да людзей, другой культуры, да мовы. Памятаю, як я баялася зняць слухаўку, калі звінеў тэлефон — амерыканская мова адрозніваецца ад англійскай, якую нам выкладалі ў школах і інстытутах. Але Макс цярпліва вучыў: «Кажы, хэлоў», калі не зразумела, выбачайся і прасі паўтарыць больш павольна, «пліз»... Але, шчыра кажучы, мне падаецца, што я цалкам так і не адаптавалася. Не, лепш сказаць так. Мы адаптавалі акалічнасці пад сябе. Усё ў нас там па-нашаму: і сябры, і мова, і фільмы, і бібліятэка. А цяпер нават і лазня.

***— А якія якасці вам найбольш імпануюць у амерыканцах?***

— Мне падабаецца іх бязмежная ветлівасць. На кожным кроку ты чуеш «прабачце», «калі ласка», «дзякуй»... І ўсё гэта з усмешкай, незалежна ад настрою, у якім ты іх заспееш. Але здзіўляе і прамалінейнасць мыслення. Усё ж такі розум нашага чалавека, як мне падаецца, больш спрытны.

***— Ксенія, я думаю, што многія з вашых мар ужо ажыццявіліся. Але якія з іх чакаюць сваёй чаргі?***

— Я заўжды марыла аб вялікай, шчаслівай і дружнай сям'і. Для мяне гэта ўсё, дзеля чаго я жыву. Ну а аб чым яшчэ можа марыць маці чатырох дзетак? Каб мір быў на зямлі. Каб дзеці былі выхаванымі, здаровымі і ўдзячнымі. Прычым зычу гэтага ўсім дзецям на зямлі!

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*
**Фота з архіва сям'і Мірных.**

***Цалкам інтэрв'ю чытайце на сайце zvyazda.by***


Адно з галоўных сямейных захапленняў — рыбалка.

# Правілы жыцця ЛІЛЬКІНАГА ТАТЫ


Фота Уладзіслава БАРЫСЕВІЧА, onliner.by

На мінскім паўмарафоне Дзмітрый з Лількай пераадолелі 21 кіламетр «з хвосцікам».

## ПРА КОСКУ, ЦЁПЛЫ ДУШ І АСАБЛІВЫ СВЕТ

**Тры гады таму** я апынуўся ў вельмі дзіўным месцы пасярод свайго жыцця. Было яно пустым — і цемра над прорвай. Адно маё дзіця ўжо пайшло ў школу, на другім тым часам медыкі паставілі «крыж». З кожным днём Лільцы рабілася ўсё горш, у жонкі пасля пяці гадоў змагання — глыбокая дэпрэсія... Крама, якая карміла сям'ю, адной красавіцкай раніцай згарэла дашчэнту. І вось сяджу я ў велізарнай кватэры, за якую ўжо няма чым плаціць, пад акном стаіць машына, у якой няма паліва, дачку не пакінуць, не выйсці. Ды і куды? Самы час узяць у рукі вяроўку, мыла і паставіць кропку. Але Нешта стрымала... І я ў адчаі паставіў коску. Пачаў вывучаць розныя методыкі і сур'ёзна займацца Ляляй.

**Людзі, якія не сутыкаліся з ДЦП, думаюць,** што калі дзіця не можа хадзіць і гаварыць, то ў яго няма ні думак, ні інтэлекту, ні душы. І што з ім можна абыходзіцца, як з «бервяном», гаварыць пра яго ў трэцяй асобе ў яго прысутнасці, адзяваць у абы-што, карміць з абы-якога посуду... Хоць насамрэч калі паглыбляешся ў гэтую тэму, то разумееш, што інтэлект ёсць, проста ён іншы, не такі, як у звычайных людзей.

**Нашы перамогі для іншых незаўважныя.** Лілька як не хадзіла, так і не ходзіць. Як не размаўляла, так і не размаўляе. Але для мяне прагрэс відавочны. Раней ночы напралёт даводзілася сядзець з дачкой на руках, бо яна прачыналася кожныя паўгадзіны і крычала. На харчаванне ў дзень ішло больш як тры гадзіны. Запіхвалі ежу — працёртую — за язык лыжкай сілай. Але яна практычна не засвойвалася. Ужо само па сабе такое кармленне можа выклікаць псіхічнае расстройства ў таго, хто корміць. І вось прайшло тры гады. Мы спім па начах. Сутаргі, з-за якіх нам было адмоўлена ў рэабілітацыі, зніклі да мінімуму і не перашкаджаюць жыць. Я навучыўся здымаць іх пальцамі, а не таблеткамі. Нам ужо не патрэбна ніякая асаблівая ежа. Больш за тое, дзякуючы Лільцы і наша харчаванне стала больш простым і здаровым.

**Узімку мы акунаемся ў палонцы,** летам купаемся ў возеры, катаемся на веласіпедзе, бегаем з каляскай. Усё гэта магчыма таму, што ў Лількі цяпер выключнае здароўе. Многія лічаць, што чалавек з інваліднасцю не можа быць здаровым. Гэта не так. У той жа Амерыцы такія людзі жывуць да глыбокай старасці, а ў нас сярэдняя працягласць жыцця інвалідаў дзяцінства — 23 гады. Менавіта з-за дрэннага здароўя, а не інваліднасці.

**Ліля змяніла мяне** кардынальна. Яшчэ год таму не мог нават уявіць, каб выліць на сябе вядро халоднай вады. Як і большасць, любіў цёплы душ, камфорт... Цяпер мне ў сто разоў цяжэй жыць, чым было раней, але настолькі ж і цікавей. Гэта як ныруць пад ваду: яна цісне і можа раздушыць, але ты ніколі не ўбачыш усёй глыбіні, калі застанешся на паверхні.

**Я раптам зразумеў,** што знаходжуся і ў асаблівым свеце, і ў звычайным. Адначасова. Прычым у звычайным свеце я жыву пераважна ўшырыню. Мяне ніхто не вучыў музыцы, але я магу навучаць ёй свайго сына. Седзячы побач на канапе. Мучыць яго гама і сальфеджыа. І ганарыцца яго поспехамі не менш, чым ганарыўся б сваімі. Хочацца дасканаласці. Каб яна крочыла побач. Цешыла б мае амбіцыі.

**У асаблівым свеце ўсё не так.** Я ніколі не ўмеў спяваць, але, калі было патрэбна, гадзінамі мог «прысвячаць» Лільцы песні, бо гук і вібрацыі яе супакойвалі. Я ніколі не мог прымусіць сябе прачытаць ніводнай кнігі пра тое, як абыходзіцца з дзецьмі. Цяпер жа ўсю мастацкую літаратуру выціснулі артыкулы па псіхалогіі і неўралогіі. Яшчэ крыху, і я змагу зарабіць фізіятэрапіяй (усміхаецца). Бо ніхто не ўзяўся яе лячыць, і таму я лячу сам. Вучуся, і ў мяне атрымліваецца. Сам зрабіў сайт, пачаў весці блог... У маім асаблівым свеце я расту не ўшырыню, а ўглыбіню. Хочацца спасцігання, дасканаласці. Не побач. Унутры.

*(Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## ПРА ВЕЛАПРЫЧЭП, ЧАТЫРЫ СЦЯНЫ І КАТЭГАРЫЧНАЕ «НЕ»

**Усе мы нешта робім разам** з нашымі блізкімі — дзелімся думкамі, чытаем кніжкі, наразаем салаты, ходзім у кіно. Менавіта агульныя справы нас збліжаюць. Самае ж складанае ў зносінах з такім дзіцем, як Лілька, — адсутнасць сумесных заняткаў, здольная разбурыць нават самыя блізкія адносіны. І я пачаў шукаць шляхі збліжэння...

**Калі ўпершыню пайшлі ў філармонію,** паводзіны ў яе былі асацыяльныя. Лілька магла ў любы момант закрычаць. Таму я сядзеў напагатове ля выхада. Некалькі разоў падчас канцэрта даводзілася выбягаць з залы. З часам я заўважыў, што публічныя месцы станоўча ўплываюць на дзіця. Калі мы знаходзімся ў соцыуме, Лілька пачынае падпарадкоўвацца яго правілам.

**Сёння мы з дачкой ходзім** у оперны тэатр, у цырк, на хакей, у басейн. Праўда, з цяжкасцю ўдалося знайсці інструктара, які пагадзіўся прымаць нас у той жа час, што і звычайных дзяцей. Да гэтага ў паліклініцы пайшлі нам насустрач — дазволілі хадзіць плаваць. Прыходзім: пусты басейн і інструктар, які не зусім уяўляе, што з такім дзіцем рабіць. «А дзе іншыя дзеці?» — цікаўлюся. «Ведаеце, яны шмат чаго ўмеюць, а вы нічога. Будзеце замінаць адно аднаму». Я зразумеў, працягваць туды хадзіць — значыць далей заганяць Лільку ў «гета». Цяпер мы ходзім у прыватны басейн. Там зусім іншая абстаноўка, зусім іншы настрой. Мноства мамак са звычайнымі дзеткамі. Малыя пачынаюць хваліцца, хто на што здольны, ныраць. Гляджу — і Лілька мая нешта спрабуе *(усміхаецца)*.

**Дзякуючы Лільцы,** дарэчы, я пачаў верыць у цуды. У нас не было бегавой каляскі для дзяцей з інваліднасцю. Паглядзеў на сайце — яна каштуе паўтары тысячы долараў. Дзе я вазьму такія грошы? Без задніх думак напісаў пра нашу мару ў блогу. І неўзабаве каляска дасталася нам у дар ад іншай сям'і! Пару месяцаў таму я прымацаваў яе да свайго ровара. З таго дня мы з Лількай накаталі больш як 500 кіламетраў. На самой справе бег з каляскай, язда на ровары — гэта тая ж рэабілітацыя. Вібрацыя, сустрэчны вецер, паскарэнне-тармажэнне. Да таго ж катацца — гэта процьма станоўчых эмоцый.

**Калі ў мяне пытаюцца,** «а чаму вы думаеце, што гэта дзіцяці падабаецца?», адказваю: «А чаму вы думаеце, што гэта ў прынцыпе можа не падабацца?» І дзвойчы зняў нашу прабежку на камеру. Тое, што мы бачым: бераг возера, сонца, аблокі, дарогу, якая праносіцца перад вачыма. А пасля прыйшоў, лёг на канапу, на яе месца, і зняў карціну, якую Лілька бачыць, знаходзячыся ў чатырох сценах. Вельмі ўражальны ролік, я вам скажу.

**Неяк мы адправіліся ў гандлёвы цэнтр «Замак».** Ці шмат мы там сустрэлі інвалідаў? Па пальцу пералічыць. Вось гэтым пальцам мы і былі. І гэта пры бясплатнай стаянцы, ліфтах, эскалатарах, адсутнасці бар'ераў. Навошта здзіўляцца, што на нас коса глядзяць, дзе б мы ні з'явіліся? Калі мы там з'яўляемся не часцей месіі... Я падышоў да касіркі і спытаў, ці можна мне прыйсці на каток з Лількай і спецыяльнымі канькамі для інвалідаў. «У нас такіх канькоў няма», — здзівілася тая. «А калі я прыйду са сваімі?» Жанчына паклікала адміністратара. «Не, — кажа той, — нельга». Іншага я і не чакаў. Адкуль узяцца «так», калі ніхто нават не ведае пра такую магчымасць і неабходнасць. Дзіця з ДЦП ва ўяўленнях большасці — гэта істота, якая ляжыць у памперсах у ложку. Праз пяць хвілін тлумачэнняў катэгарычнае «не» перамянілася на «так». З невялікай умовай, каб толькі раніцай, гадзін у 10, калі народу паменш. А не спытаў бы, так і лунала б вечнае «не», як мерзлата за палярным кругам.


Фота Надзеі БУЖАН.

Упершыню ў сваім жыцці Ліля ўсміхнулася, калі слухала, як брат грае на акардэоне.

## ПРА ДАЛЁКІХ БЛІЗКІХ, ЛЮБОЎ НА СПРАВЕ І 12 ХВІЛІН

**З тых часоў, як медыцына спісала нас у безнадзейныя,** я шмат чаго даведаўся. Пра людзей — далёкіх блізкіх і блізкіх далёкіх. Пра розніцу паміж любоўю і жалем. Пра любоў на справе і любоў у вельмі прыгожых словах. Пра мінакоў, якія зазіраюць у нашу каляску — хто з нездаровай цікавасцю, хто са страхам, хто са старанна прыхаванай агідай. Ці не зазіраюць зусім — нам справа да вас, ці што... Пра самога сябе, урэшце, я таксама сёе-тое даведаўся. Пра тое, што я магу не бегаць ад праблем, якія здаюцца невырашальнымі. Нават калі збоку гэта выглядае неразумным «забойствам» сябе.

**Першае, што губляеш са з'яўленнем хворага дзіця,** дык гэта сэнс жыцця. Ты адрываешся ад звыклых заняткаў, ад планаў і перспектыў. У сям'і пануе атмасфера безвыходнасці, страху перад будучыняй. Таму не дзіўна, што яна распадаецца, і з дзецьмі няма прагрэсу. Ды і пра даходы ў нас неяк не прынята казаць. Дзіцяці, пакуль яно маленькае, у прынцыпе, нейкія грошы паступаюць. Але вось яму спаўняецца 18 — усё, больш ніякай дзіцячай дапамогі. Нібы яно вырасла. А маці да гэтага часу губляе свае сацыяльныя кантакты, працу... Гэта трагедыя. У нас атрымліваецца, што дарослы, самастойны і здаровы чалавек не можа сябе рэалізаваць больш, чым у доглядзе свайго дзіцяці. Мы атрымліваем двух інвалідаў замест аднаго.

**Калі мы былі з Лількай у Амерыцы,** заўважыў, што там такога, як у нас, шоку ў сувязі з нараджэннем дзіцяці з інваліднасцю няма. А ўсё таму, што ў людзей не з'яўляецца адчуванне пакінутасці, аддаленасці ад усяго свету. Соцыум іх прымае. Там вельмі папулярныя марафоны, у якіх прафесійныя спартсмены штурхаюць перад сабой каляскі з асаблівымі дзеткамі. У прыватнасці бацька і сын, Дзік і Рык Хойт (у Рыка ў восем месяцаў выявілі ДЦП), на працягу 37 гадоў удзельнічалі ў падобных забегах. Мне б хацелася, каб і ў нас сем'і, дзе ёсць дзеці-інваліды, таксама пачалі аб'ядноўвацца, займацца нейкімі цікавымі рэчамі, радавацца жыццю разам з усімі. Менавіта таму я і ініцыяваў стварэнне клуба аматараў бегу з каляскай, клуба бацькоўскай ініцыятывы «Садзея». Дарэчы, наступны мінскі паўмарафон хачу бегчы камандай.

**Ёсць перакананне,** што асаблівыя дзеці нічога не змогуць зрабіць карыснага для грамадства. Але гэта не так. Я на паўмарафоне прабег 21 кіламетр, штурхаючы перад сабой каляску з дачкой, на 12 хвілін хутчэй, чым мог прабегчы адзін. Як гэта можна патлумачыць? А чаму людзі так радаваліся, калі мы дабеглі? Гэта ўсё нейкая невытлумачальная энергія, якой не было б, каб не было такога дзіцяці. І яшчэ адно назіранне. Падчас марафону адзін спартсмен некалькі разоў прапаноўваў мне дапамагчы зацягнуць каляску пад горку. Быў гатовы ахвяраваць часам, сіламі і вынікам дзеля тых, каму бегчы было складаней. Вось бачыце, зусім бездапаможнае з выгляду дзіця можа дапамагчы людзям пераадолець свой звыклы панурны выгляд, усміхнуцца, выйсці за свае межы, зрабіць свет дабрэйшым.

Надзея ДРЫЛА.
*dryla@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** | | | | |
| **Продавец** | **Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** | | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | | |
| **№ лота** | **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| Лот 1 | Магазин №39 | Здание специализированное розничной торговли | 137,7 кв.м | 600/С-139782 | Минская обл., Минский р-н, Роговский с/с, д. Головачи, 2А |
| **Сведения о земельном участке**: | пл. **0,2038 га** предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 18.09.2032 для обслуживания здания магазина | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 210 000 000 белорусских рублей** | | | | | |
| Лот 2 | Магазин №53 | Здание специализированное розничной торговли | 68,1 кв.м | 600/С-139976 | Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, д. Гатовино, 17А |
| **Сведения о земельном участке** | пл. **0,0311 га** предоставлен продавцу на праве аренды по 17.09.2032 для обслуживания здания магазина | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 100 000 000 белорусских рублей** | | | | | |
| Лот 3 | Магазин № 63 | Здание специализированное розничной торговли | 97,7 кв.м | 600/С-136917 | Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, д. Великое Село |
| **Сведения о земельном участке** | пл. **0,0768 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 06.12.2041 для обслуживания здания магазина с ограничением (водоохранная зона) | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 152 000 000 белорусских рублей** | | | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также оплаты вознаграждения и возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | | |
| *Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.09.2015 г.* | | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.10.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **26.10.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71. auction@cpo.by. www.cpo.by** | | | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже права заключения договора аренды помещений РУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| **Наименование, местонахождение и характеристика объекта** | Право заключения договора аренды помещения площадью 9,8 кв.м в здании вокзала станции Пинск (инв. № 130/С-30826) по адресу: ул. Железнодорожная,19 в г. Пинске, *для размещения офиса, осуществления розничной торговли, оказания услуг связи, оказания страховых услуг* | Право заключения договора аренды помещения площадью 9,3 кв.м в здании вокзала станции Пинск (инв. № 130/С-30826) по адресу: ул. Железнодорожная, 19 в г. Пинске, *для размещения офиса, осуществления розничной торговли, оказания услуг связи, оказания страховых услуг* | Право заключения договора аренды части помещения площадью 2,0 кв.м в здании вокзала станции Пинск (инв. № 130/С-30826) по адресу: ул. Железнодорожная, 19 в г. Пинске, *для размещения кофейного аппарата* |
| **Балансодержатель** | Транспортное республиканское унитарное предприятие «Брестское отделение Белорусской железной дороги» | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | 294 000 | 279 000 | 60 000 |
| **Сумма задатка (руб.)** | 29 000 | 27 000 | 6 000 |
| **Срок аренды** | 3 года | 3 года | 3 года |
| **Сумма арендной платы в месяц** | 7,350 базовой арендной величины | 6,975 базовой арендной величины | 1,50 базовой арендной величины |
| **Условия оплаты** | разовый платеж | разовый платеж | разовый платеж |
| **Размер штрафа, руб.** | 18 000 000 | 18 000 000 | 18 000 000 |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Организатор аукционных торгов** | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. www.bgcn.by** | | |

ПРИМЕЧАНИЕ:

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь: копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3. индивидуальным предпринимателем: копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

*Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.*

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 17 ноября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 15.10.2015 г. до 17.30 11.11.2015 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; выходной день: сб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by**

**Суд Фрунзенского района г. Минска** просит сообщить все известные сведения, в том числе о месте пребывания, в отношении ГРИГОРЬЕВА Александра Владимировича, 27.03.1958 года рождения, последнее известное место жительства: г. Минск, ул. Одинцова, 43-235.

Указанные сведения необходимо сообщить суду по адресу: г. Минск, ул. Дунина-Марцинкевича, 1/2-233 (т./факс 205-09-84) в течение 2 месяцев с момента опубликования данного объявления.

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Датч Стар»,

**опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181,
строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского)
со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...стоимость **1 кв.м** для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир, площадью **40,68 кв.м**, на 3, 5, 12, 15 этаже – **1200** (одна тысяча двести) долларов США».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: **г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел.: 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Открытый аукцион состоится 18.11.2015 г. в 15.00 по адресу:
220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 68 (конференц-зал «Магнат»).
Организатором открытого аукциона является
республиканское унитарное предприятие «Президент-Отель»,**
находящееся по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18.

На аукционе выставляется право заключения договора возмездного оказания услуг (далее – договор), согласно условиям которого, в случае обращения гостей, посетителей гостиницы «Президент-Отель» за оказанием услуг по перевозке пассажиров автомобилями-такси, государственное предприятие «Президент-Отель» обязуется принимать от клиентов заявки и передавать их компании-победителю аукциона.

Существенным условием договора является обязанность участника предоставлять для оказания услуг по перевозке автомобили среднего класса и высшего среднего класса (в соответствии с европейской классификацией Классов D и E), исключительно с годом выпуска не позднее 2008 года.

Стоимость услуг по договору составляет 30 000 000 бел. рублей в месяц, срок действия договора – 1 год. Договор вступает в силу с 01.01.2016 г.

Права и обязанности по договорам перевозки пассажиров автомобилями-такси возникают непосредственно между компанией-перевозчиком и гостями, посетителями гостиницы «Президент-Отель».

Начальная цена продажи лота составляет 1 800 000 бел. рублей, сумма задатка 180 000 бел. рублей.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 16.10.2015 по 13.11.2015 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18, к. 602. Документы, поданные после 16.00 13.11.2015, не рассматриваются.**

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

- перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель»;

подает заявление на участие в аукционе; заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона; предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка. Помимо указанных документов:

- **индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации; **юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

По окончании аукциона в день его проведения с победителем торгов подписывается протокол о результатах аукциона.

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 18 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет республиканского унитарного предприятия «Президент-Отель» сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения.

Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор по результатам аукциона заключается в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 229-70-39, (8-029) 117-56-22.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 18.11.2015 г. в 11.00 по адресу:
220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 68 (конференц-зал «Магнат»).
Организатором аукциона является
республиканское унитарное предприятие «Президент-Отель»,
находящееся по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18.**

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

1. Помещение № 42 площадью 39,8 кв.м на первом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 194 000 бел. рублей; размер задатка – 119 400 бел. рублей; целевое использование – размещение бутика, осуществление розничной торговли ювелирными изделиями; ставка арендной платы за 1 кв.м – 3 базовые арендные величины.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 16.10.2015 по 13.11.2015 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18, к. 602. Документы, поданные после 16.00 13.11.2015, не рассматриваются.**

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- **физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;

- **индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;

- **юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 229-70-39, (8-029) 117-56-22.**

# ДЗЕ АЛГЕБРА СТАСУЕЦЦА З НЯБЁСАМІ

**У строгі двухпавярховы, без асаблівых упрыгожанняў, лапідарны, як сказалі б эстэты, будынак манастыра, калісьці базыльянскага мужчынскага, а потым (і цяпер) — Свята-Пакроўскага жаночага, можна трапіць з гаспадарчага двара. А можна і праз парадняе. Вось пра ўсё гэта напісаў у сваіх мемуарах аб Талачыне Арман дэ Каленкур — і дзе начавалі, і што гаварылі, і пра што марылі — а пра тое, якім уваходам Напалеон скарыстаўся, не напісаў. Але на другі паверх ён наўрад ці трапіў іначай, чым праз шырокую лесвіцу пад велічнымі скляпеннямі ўзору XVIII стагоддзя — тут ужо, як той казаў, без варыянтаў.**


Каля параднага.

Ступаць там, дзе ступала нага Напалеона, — гэта, безумоўна, хвалюе. Асабліва калі дакладна ведаеш: тое, на што ты цяпер глядзіш, яго вочы таксама бачылі. Вось вялікая трапезная. Калі ў манастыры збіраецца шмат гасцей, іх прымаюць не ў малой, што на першым паверсе, побач з келлямі, а ў гэтай. Тут і адбылася нарада, на якой абмяркоўваўся лёс бітвы Напалеона з Кутузавым.

— Гэты працаўнік не надта ўмее ваяваць, — разважаў Напалеон. — Калі завязваецца бой, то б'ецца ён з адвагай, але ў вялікай вайне — ані не разумее.

І ўсё ж акалічнасці гэтай вайны склаліся на карысць рускага «няўмекі», а яго вялікасці французу давялося ў спешцы распальваць агонь і нішчыць у ім дакументы, эмблемы, экіпажы, сцягі...

Мост цераз Бярэзіну, на які ў імператара Францыі былі вялізныя спадзяванні, пра ахову якога ён думаў як пра звышнадзейную, па якім разлічваў перапраўляцца, — разбураны. Цяпер што? Цяпер, хто хоча трапіць у Францыю, павінен літаральна перайсці Бярэзіну. Цяпер, маўляў, няхай кожны, хто сталуецца «пры двары», пра сваё талеркі, калі хоча працягваць імі карыстацца, клапоціцца самастойна. Бо лепш, маўляў, да канца кампаніі есці рукамі, чым пакінуць рускім хоць адзін відэлец са сваёй манаграмай.

Калі, трапіўшы ў манастырскі корпус, вы ўбачыце трошкі правей ад вялікай трапезнай вузкі пакойчык, ведайце: тут Напалеон на чвэрць гадзіні задрамаў. Імператара даймаў насмарк, таму які там сон — толькі што дрымота. Прыбліжаныя, Дару і Дзюрок, перакінуліся словамі і ўжо хацелі пакінуць пакойчык, але тут імператар прачнуўся. Пра што, маўляў, размаўлялі?

— Мы марылі пра паветраны шар.

— Навошта?

— Каб пераправіць вашу вялікасць.

Сапраўды, калі мост разбураны, дык хіба што лётам ратавацца. І ўзбагаціцца з таго дня французская мова на адзін афарызм, які змяшчае беларускі тапонім: c'est la Berezina — «гэта Бярэзіна», то бок катастрофа, поўны аўт.

Усё апісанае адбывалася ў талачынскім манастыры вечарам 22 лістапада 1812 года. Але сцэны, якія чуюць і бачаць, умеюць запамінаць, і памяць іх распаўсюджваецца і на дзвесце, і нават на болей гадоў. Узведзеныя ў часы, калі Талачын належаў Сангушкам, яны, безумоўна, памятаюць і час, калі ў іх размяшчаўся храм у гонар святыцеля Мікалая — «зімні», «цёплы». Прычым, у якім дакладна памяшканні ён быў, ведаюць цяпер бадай толькі яны, гэтыя сцэны, памяць якіх, між іншым, доўжыцца ад 1769-га. Прынамсі, менавіта ў гэтым годзе быў атрыманы фундуш, па якім будынак аддаваўся ў распараджэнне манахаў ордэна базыльянаў.


Бацюшка благаславіў сясцёр на ўціхамірванне гэтага ката.

Сённяшнія келлі, хутчэй за ўсё, і ў той час былі келлямі. Часткова. А часткова — вучэбнымі класамі. Бо тут аднаchасова працавала свецкае прыходскае вучылішча і жылі пяць манахаў-базыльянаў, якія прысвячалі свае дні не толькі малітвам, пастам і звыклай працы, але і высакароднай справе выхавання і адукацыі насельніцтва. Пазней, ужо «пасля Напалеона», тут было заснавана духоўнае вучылішча, адметнае тым, што выпусціла ў свет першых пасля перыяду ўніяцтва праваслаўных святароў. «Нельзя ли толочинский Базилианский монастырь, где монахи сего Ордена содержат училище для светского юношества, уступить духовному начальству?» — пытаў епіскап Сямашка ў прыватным лісце да апекуна беларускай вучэбнай акругі. Прапанову палічылі «совершенно основательной и сообразной», і «утвердить сие предложение соизволил Его императорское величество».

Вялікі храм побач з манастырскім корпусам мае тыповы выгляд віленскага барока: «вытанчаны вертыкалізм сілуэтаў», «шматпланавасць фасадаў», «хвалі ўвагнутых і выгнутых крывых», «быццам будаўнічы матэрыял расплавіўся і пацёк»... І гэтым «красамоўствам» можа ўвесці ў зман наконт часу сваёй пабудовы. Насамрэч, як сцвярджаюць сёстры і архівы, храм гэты сваімі асобнымі часткамі памятае часы нашмат ранейшыя: самы пачатак XVII стагоддзя, будоўлю па распараджэнні Льва Сапегі. Яго ў адрозненне ад унутранага «сангушкаўскага» храма называлі «халодным», «летнім». Але калі вам даводзілася дакранацца да цэглы, якая выраблялася чатырыста або пяцьсот гадоў таму, вы ведаеце, што яна прыемна цёплая. І мае дзіўную гладкасць, і неаднастайная па памерах. Вось я дакранаюся да цаглінак, выцягнутых рэстаўратарамі з-пад саляі, а ў гэты момант на руку ігуменні манастыра падае ржавы цвік. Матушка Анфіса беражліва перакладае яго з рукі ў руку і быццам узважвае на шалях часу: колькі яму?

У храме, як чытач, пэўна, здагадаўся, вядзецца рамонт. Ён вядзецца ўжо працяглы час, і працэс гэты самым літаральным чынам адбіваецца на спісе з Бялыніцкага абраза Божай Маці: лік Яе святлее!

Трэба разумець, што падарожжа ў манастыр ніяк не можа быць «гультайскім». Вы прыязджаеце паглядзець на архітэктуру, памацаць час і ўдыхнуць трошкі гісторыі, а паміж гэтымі заняткамі вам тут знойдзецца сапраўдная фізічная праца. А ўзнагародай за яе стане аповед. Ну, напрыклад, пра тыя часы, калі храм быў непрыступнай крэпасцю, пра што сведчыць захаваная да нашых дзён асаблівая сістэма засавак. Прывёўшы ў дзеянне ўсе яе элементы і механізмы, можна колькі заўгодна доўга адчуваць сябе ў храме ў поўнай бяспецы. А захочаце, дык пачуеце і пра тое, якія цуды адбываюцца ў гэтых сценах у нашы дні.

Хто ведае, мо вам будзе дазволена пасяліцца ў тым самым маленькім пакойчыку, дзе начаваў Напалеон? Паломнікі спыняюцца ў ім...

**Падарожнічала**
**Святлана ДЗЯНІСАВА.**

## *Паслядоўнікам*

*Дарогі паміж «паштовымі» населенымі пунктамі называліся раней стаўбавымі, бо аздабляліся слупамі, якія, у сваю чаргу, іменаваліся верставымі, таму што вымяраць адлегласці на паштовых гасцінцах з XVIII стагоддзя належала ў вёрстах. Дык калі вы ўжо трапілі ў Талачын, вам ніяк нельга абмінуць двух «нетыповых» сведкаў мінулага — верставыя слупы, што дагэтуль стаяць на шляху з Талачына ў Круглае. Арыенціры месцаў, дзе варта загадваць жаданні, — вёскі Ганчароўка і Зялёнае.*

## *Рамантыкам*

*Часам у доўгай дарозе паказальнікі чытаць надакучвае. І ў вокны пазіраць таксама. Тады ў мяне ў руках з'яўляюцца кручок і нітка. Дарога пад колы — нітка пад кручок. Мне падабаецца, калі на руках застаецца пыл старой закінутай сядзібы, які пераносіцца на карункі. Тады сурвэткі, абрусы і фіранкі памятаюць месцы нашых падарожжаў.*


Манастырскі калодзеж.

## Што бывае

### НАЗІРАННІ

➤ *Едзеш і чытаеш паказальнікі. І дзівішся — то недарэчнасцям, а то наадварот. Праязджаем паварот на вёску Амяльная, а перад тым мо некалькі кіламетраў запар назіралі на прыдарожных дрэвах шчодрыя россыпы амялы. На вёску Ёлкі. І хоць бы дзе елку ўбачылі...*

### БЯЗГЛУЗДЗІЦА

➤ *Калі ўважліва прыглядацца да некаторых адметнасцяў, якія сустракаюцца па дарозе, і сёе-тое аналізаваць, можна прыйсці да высновы, што Беларусь, на колькі б частак ні дзялілася, так бы мовіць, «адміністрацыйна-тэрытарыяльна», насамрэч дзеліцца на дзве паловы. Нам больш даспадобы тая, дзе вокны адчыняюцца вонкі. Па ёй часцей і вандруем.*

## ДАЛЁКА І БЛІЗКА

**Тыдзень кансерваторый адкрыецца 23 кастрычніка ў Вялікай зале філармоніі Санкт-Пецярбурга музыкай Чайкоўскага. Што выбраць далей? У Смольным саборы — харавы марафон этнічных ансамбляў, у Шарамецьеўскім палацы — канцэрт музыкаў Францыі і Італіі, у камерных залах Марыінкі-2 — унікальны фальклор з усяго свету.**

Кірмес у Германіі — што нашы дажынкі. Адрозненні можна па пальцах пералічыць. Кірмес праводзіцца не толькі ў маленькіх гарадках, але і ў вёсках, і пачынаецца з працэдуры адкопвання саламянай лялькі (яна і ёсць Кірмес), закапанай на два тыдні раней з бутэлькай шнапсу. У першы дзень пасля адкопвання вакол Кірмеса танцуюць, каштуючы крэндзелі, у другі — наведваюць магілы родных, у трэці... закопваюць Кірмес, і зноў з бутэлькай шнапсу, але дабавіўшы яшчэ і галаву пеўня, костку ад кумпяка і кавалак пірага. Быццам дзякуюць. Першы дзень свята — 18 кастрычніка.



**21 кастрычніка святкуецца Дзень яблыка. Вядома, у Англіі. Праўда, Apple Day прысвячаецца не сэру Ісааку Ньютану, а разнастайнасці — фізічнай, генетычнай і культурнай. Калі трапіце на свята, убачыце, як гатуюцца яблычныя стравы, пакаштуеце іх, пастраляеце з лука (цэльцеся ў яблычак!), паўдзельнічаеце ў конкурсе на адразанне самай доўгай яблычнай скуркі, паслухаеце «яблычныя» аповеды.**



У любы дзень сёлетняй восені, асабліва ў слотны, шэры наведайце Мірскі замак, нават калі вы там ужо былі. Нагода? У яго зборах з'явілася чайная пара з бісквітным барэльефам. Смачнае найменне экспаната азначае неглазураваную выяву Фрыдэрыкі Дароты Луізы Філіпіны Прускай, жонкі апошняга гаспадара замка з роду Радзівілаў князя Антонія Генрыка. Кажуць, што з такіх кубкаў гарбату ніколі не пілі, захоўвалі як сувеніры. Ну, гарбаты вы потым пап'еце, у якой-небудзь карчме пры дарозе. І так слотны, шэры настрой восені зазалаціцца ўсмешлівым мажорам.

**Што цікавага ў Дзяржынску? У тамтэйшым гісторыка-краязнаўчым музеі ажно да сярэдзіны снежня можна бачыць шляхецкія ды мяшчанскія інтэр'еры. Мэбля, посуд, прадметы асабістага карыстання... У старасвецкіх пакоях заўсёды ёсць нешта таямнічае. І хто ведае, мо вам удасца праз музейную прастору трапіць у старое Койданава?**



Тэатральны фестываль — падзея нетурыстычная. Але вартая культурнай увагі. Тым больш калі размова ідзе пра Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і рэспубліканскі тэатральны фестываль яго імя, які пройдзе ў Бабруйску 27—31 кастрычніка. Свае працы там пакажуць тэатры з Расіі, Украіны, Малдовы, Латвіі і, безумоўна, Беларусі.

■ Рэліквія маёй сям'і

# ПРАБАБУЛІН ПЯРСЦЁНАК

## дапамагае захоўваць гісторыю свайго роду магіляўчанцы Эле Чарновай

**— Вось ён, заручальны пярсцёнак маёй прабабулі, — Эла з годнасцю дэманструе мне сваю сямейную рэліквію. Яна сціпла ляжыць у спецыяльнай аксамітнай каробачцы. «Гэта ж не нейкае там банальнае ўпрыгожанне — знакавая для сям'і рэч, якую мы павінны захаваць для нашчадкаў», — тлумачыць яна, перахопліваючы мой здзіўлены позірк, маўляў, чаму не на пальцы.**

На жаль, дзе набыты гэты пярсцёнак, сямейная гісторыя замоўчвае. Але кожны са спадчыннікаў ведае ўсё пра яго першых уладальнікаў.

— Яе звалі Магдалена Францаўна, а прадзеда — Іосіф Сямёнавіч Грыб, — расказвае падрабязнасці Эла Чарнова. — Прадзед мой быў заможным селянінам і служыў кіраўніком у пана. Жыў ён у вёсцы Вызваленне Дзяржынскага раёна. Пан, з'язджаючы ў Рыгу па сваіх справах, узяў з сабой і майго продка. Там, хутчэй за ўсё, і быў набыты гэты пярсцёнак. Калі меркаваць па даце нараджэння першынца Іосіфа (мой дзядуля), падзеі адбываліся прыкладна ў 1912 годзе. Потым на свет з'явіліся Мікалай і дачка Яўгенія.

**«На гэтай рэліквіі адбіткі іх пальцаў, іх энергетыка, сіла, якая здольная аб'яднаць не падобных адзін на аднаго людзей».**

Каб нашчадкі ведалі свае карані, бацька Элы — Іосіф Грыб, вядомы ў Магілёве ўрач, занатаваў усё, што ведаў пра родных некалькіх пакаленняў. Незадоўга да смерці ён паставіў апошнюю кропку. Кніга напісана ад рукі, а ў аўтара, як звычайна гэта бывае сярод урачоў, быў не вельмі добры почырк. Таму ён прыклаў максімум намаганняў, каб пісаць зразумела. На першай старонцы пазначыў, што ў былыя часы першай справай любога самавітага чалавека было весці свой радавод. І вельмі хацеў, каб такой традыцыі прытрымліваліся і ў яго сям'і. Бо чалавек, лічыў ён, моцны сваімі каранямі. Складзены радавод, вядома, не па старадаўніх канонах. Але ніхто такой мэты і не ставіў. Хацелася пакінуць як мага больш разнастайнай інфармацыі пра ўсё, што мела дачыненне да роду. Знайшлося месца для інфармацыі пра населеныя пункты, дзе нарадзіліся продкі, уражанням ад падарожжаў і нават асабістым думкам. Узгадваючы дзеда Іосіфа Сямёнавіча, унук пісаў, што сям'я яго (усяго трое дзяцей!) была па тых часах маленькая і таму жыла заможна. Не кожны галава сям'і мог сабе дазволіць ашчаслівіць жонку шлюбным пярсцёнкам.



У раздзеле, прысвечаным сабе, аўтар пазначыў, што нарадзіўся ў неспакойным 1937-м і быў адзіным дзіцем у сям'і. Яго бацька, таксама Іосіф Іосіфавіч, падчас вайны трапіў у палон. Дадому ён ужо не вярнуўся. Бацькі (тыя самыя ўладальнікі фамільнага пярсцёнка) балюча перажывалі гэтую страту і з задавальненнем бралі да сябе маленькага Іосіфа. Дзядуля рабіў яму драўляныя цацкі, а бабуля ўвесь час корпалася каля печкі, гатавала ежу. Трэба было ж унука смачна накарміць!..

Жыццё другога сына Магдалены Францаўны і Іосіфа Сямёнавіча — Мікалая — было больш удалым. Ён працаваў шафёрам, пабудаваў у Мінску вялікі дом, выхаваў двух сыноў — Міхаіла і Аляксандра.



Эла Чарнова блаславіла дачку на шлюб прабабулінай іконай.

А вось дачка Яўгенія, якая атрымала ў спадчыну ад маці фамільны пярсцёнак, так і не знайшла сабе пару, засталася жыць адна. Пад старасць пераехала да брата Мікалая ў Мінск, даглядала пляменнікаў. Летам туды ж прыязджалі ў госці ўнучкі Іосіфа — Эла і Жанна. І аднойчы Яўгенія зрабіла незвычайны падарунак старэйшай з іх.

— Усё пачалося з таго, што мае дзядзькі, Міша з Сашам, вырашылі падарыць мне магнітафон, — успамінае знамянальную для яе лёсу падзею Эла. Яна тады яшчэ вучылася ў шостым класе. — Сэрца маё радасна забілася, але тут умяшалася Жэня. Яна цвёрда заявіла, што ў яе ёсць больш каштоўны падарунак для мяне. І дастала... пярсцёнак.

Можна сабе ўявіць расчараванне 12-гадовай дзяўчынкі, якая ў адну хвіліну страціла шанц атрымаць модную па тых часах рэч. Пярсцёнак тады мала чым яе цікавіў і вялікай радасці не выклікаў. Яна моўчкі прыняла падарунак, як прыкрую непазбежнасць. І толькі праз некалькі гадоў ацаніла, наколькі каштоўным аказалася тое, што перадала ёй стрыечная бабуля. Магнітафон даўно б пайшоў на сметнік, а пярсцёнак як-ніяк — сямейная рэліквія! Вялікай матэрыяльнай каштоўнасці ён не ўяўляе — золата вельмі тонкае, важыць дзесьці каля 2 грамаў. Але ж гэта як анёл-ахоўнік роду, носьбіт яго духоўнага пачатку. На ім выгравіраваны тры знакавыя сімвалы. У цэнтры — сэрца, сімвал кахання, па баках — якар, сімвал вернасці, і — крыж — сімвал веры. Проба таксама ёсць — 56-я. Сучасныя ювеліры прыраўноўваюць яе да 583-й.

Разам з пярсцёнкам сям'я атрымала ад Яўгеніі ікону ў драўляным акладзе з выявай Казанскай Божай Маці — таксама прабабуліна спадчына. Гэтым абразом Эла Іосіфаўна бласлаўляла сваю дачку, калі тая бралася шлюбам. А вось старадаўнія ходзікі выратаваць не атрымалася. Калі пачалі іх здымаць са сцяны, яны разваліліся. Больш як за стагоддзе цалкам спарахнелі.

Бацька Элы Іосіфаўны не толькі падрабязна запісаў свае ўспаміны, але і беражліва захаваў фотаздымак першаўладальнікаў пярсцёнка — Магдалены Францаўны і Іосіфа Сямёнавіча. Выглядаюць яны дастаткова рэспектабельна. Мужчына пры вусах, з камізэлькі выглядвае ланцужок ад гадзінніка, на нагах модныя востраносыя туфлі. Бабуля ў параднай спадніцы з дзіцем на руках. Напэўна, тым самым першынцам Іосіфам. На адваротным баку пазначана, што фота зроблена ў Рызе. Вядома, што бабуля пражыла 74 гады, а дзед — 60. Абое пахаваны на Навасадкаўскіх могілках у Мінскім раёне.



Іосіф Сямёнавіч Грыб паклапаціўся, каб яго род не застаўся без сямейнай рэліквіі.

На жаль, калі Эла атрымала пярсцёнак, дзіцячы ўзрост не дазволіў удакладніць у бабулі Яўгеніі нешта пра сваіх продкаў. Наогул з гэтай жанчынай цесных кантактаў не было. Яе лічылі занадта суровай, з цяжкім характарам. Як пісаў пра Яўгенію ў сваіх успамінах бацька Элы, пэўны час яна працавала грузчыцай на Мінскім аўтазаводзе і нават курыла «Беламор». Дарэчы, да курэння яна прынадзілася пасля таго, як у нямецкім палоне загінуў яе любімы брат Іосіф. Таму, напэўна, і пярсцёнак яна пакінула не нашчадкам Мікалая, у якога дажывала апошнія дні, а менавіта Іосіфа. Або лічыла, што калі маці перадала пярсцёнак дачцэ, то ён павінен і далей прытрымлівацца жаночай лініі. У Мікалая ж былі адны хлопцы, нават сярод унукаў.

З часам Эла Чарнова перадасць пярсцёнак сваёй дачцэ, і гісторыя роду будзе працягвацца.

— Не лічу сябе кімсьці дваранскай крыві, і наогул не прэтэндую на нейкую там выключнасць, — сціпла кажа суразмоўца. — Але пярсцёнак — быццам бы правадыр у часе, які злучае мяне з тымі людзьмі, якія жылі раней. На гэтай рэліквіі адбіткі іх пальцаў, іх энергетыка, сіла, якая здольная аб'яднаць не падобных адзін на аднаго людзей. Я вельмі даражу прабабуліным пярсцёнкам, бо, калі гляджу на яго, успамінаю сваіх продкаў. Мы павінны ведаць свае карані і трымацца іх. Такія рэчы дапамагаюць у гэтым.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота з сямейнага архіва.**

# «ДАРОСЛАЯ» ЛІЧБА,

## або Першы дзень народзінаў




Мы вырашылі святкаваць дома.

**— Нашаму гадавасіку хутка годзік! — усё часцей казала бабуля. І намякала, што трэба адзначаць! Сапраўды, першая дата! І мы вырашылі рабіць свята. Таму што колькі сябе помню, бацькі заўсёды, нават у самыя складаныя для нашай сям'і часы, ладзілі кожны год цудоўны дзень народзінаў. Гэтую традыцыю трэба працягваць!**

### МЕСЦА

Безумоўна, кожныя бацькі самі вырашаюць, дзе праводзіць доўгачаканае свята. Гэта можа быць дзіцячая кавярня ці нават дарослы рэстаран. Бо, па сутнасці, у гэтым узросце свята больш для мам-тат-бабуль-дзядуляў. Мы вырашылі святкаваць дома і лічым, што для нас гэты варыянт аказаўся самым аптымальным: дачка стамілася — паклалі спаць, расплакалася — побач цікавыя цацкі.

Вядома, для старэйшых дзетак можна зрабіць тэматычны дзень народзінаў — у стылі Чалавека-павука ці Папялушкі. Звадзіць у дзіцячую кавярню і наняць аніматараў. Напэўна, для нас усё гэта наперадзе. Таму сёлета абышліся простымі, але вельмі неабходнымі для маленькай імянінніцы рэчамі — гірляндамі з традыцыйным «З днём нараджэння!» і мноствам паветраных шарыкаў, якія надзьмувалі з татам ноччу напярэдадні свята. Паверце, няма большай радасці назіраць, у якім захапленні раніцай будзе ваша малеча ад такога відовішча!

### ШТО ТРЭБА НАБЫЦЬ

**Паветраныя шары.** Можна купіць самім і надзьмуць — выйдзе танна і добра, але ў адрозненні ад гелієвых, вашыя лётаць пад столлю не будуць. Адзін геліевы шарык каштуе ад 15 тысяч, замаўляць трэба ў спецыялізаваных фірмах. Там жа можна заказаць і прыгожую лічбу 1 (ці іншую), яе кошт пачынаецца ад 300 тысяч рублёў. Калі ж вы вырашыце набываць шары самастойна, памятайце, лепш за ўсё выбіраць большай шчыльнасці — шанц лопнуць у такога шарыка меншы: для дзетак, якія могуць спужацца, гэта істотны момант.

**Гірлянда.** Можна купіць гатовую папяровую, самая танная каштуе каля 20 тысяч рублёў. Можна пафантазіраваць і зрабіць яе самастойна, з паперы ці тканіны. **Вясёлыя шапачкі-каўпачкі, дзіцячы посуд** таксама дапамогуць стварыць «настрой» свята.

**Можна зрабіць своеасаблівую насценгазету** — на вялікі ватман наклеіць фотаздымкі вашай малечы. Мы ў вялікую рамку памерам 50 на 75 сантыметраў змясцілі памятныя моманты ад нараджэння і першага зуба да самастойнага кроку дачкі. А яшчэ заказалі невялічкі фотачасопіс, дзе зафіксавалі кожны месяц нашай малечы — нашым гасцям, асабліва старэйшага ўзросту, гэта прыйшлося даспадобы. Можна пайсці далей і зманціраваць слайд-шоу ці нават цэлы фільм — цудоўны фон для свята. Мы ж запусцілі розныя дзіцячыя песенькі — дарослыя час ад часу нават падпявалі знаёмым мелодыям.

**Вясёлыя конкурсы** таксама спадабаюцца і гасцям, і імянінніку. Напрыклад, можна даведацца, якое жыццё чакае малога? Раскласці на стале часнок, ключы, кнігу, кашалёк, шакалад і прапанаваць выбраць віноўніку свята (часнок — здароўе, ключы — дабрабыт, кашалёк — росквіт, кніга — веды, розум, шакалад — салодкае жыццё).

**Ежа.** Мы вырашылі зрабіць фруктова-салодкі стол! Яблыкі, грушы, персікі, вінаград, марозіва, мармелад, зефір... І, безумоўна, торт! У нас іх было ажно чатыры — тры «дарослыя» — на розны густ, і адзін для дачкі — каб яна магла яго пакаштаваць. Рэцэпт просты — невялікія кавалачкі пладоў перамяшаць з любімым дзіцячым тваражком. У цэнтры — святочная свечка. Торты мы вырашылі на заказ не рабіць — «кусачы» кошт атрымаўся. За «салодкі» кілаграм кандытары просяць трыццаць долараў, мінімальны заказ — ад 2,5 кг. Затое хочаш — табе і Губку-Боба зробяць ці гоначны аўтамабіль, персанажа з любімага мульціка... Карацей, на любы густ.



І бабуля, і ўнучка ў захапленні ад свята.

**Падарункі.** Які ж дзень народзінаў без падарункаў? Амаль усе нашыя госці задавалі пытанне «Што падарыць?». У дзетак гэтага ўзросту выклікае захапленне ўсё, што можна катаць. А калі яшчэ прывязаць вяровачку і пасадзіць любімую цацку або нават пакатацца самому — гэта двайное захапленне! Вялікія машынкі, каляскі для лялек, ровар з ручкай, санкі... Варыянтаў такіх цацак шмат. За параўнальна невялікую цану можна падарыць дзіцяці ўласны патаемны куток — палатку або домік для гульняў. Канструктары і кубікі, музычныя інструменты, пазлы-дыванкі, інтэрактыўныя кніжкі... Сёння можна знайсці падарунак на любы густ і кашалёк. Асабліва нашу малую захапіла гумовая надзіманая каза, на якой можна скакаць (як варыянт конік-качалка). І, безумоўна ж, арэлі!

Напрыканцы свята ўсім нашым гасцям мы таксама вырашылі зрабіць памятныя сувеніры — мыла з імем дачкі. Бо падарункі прыемна не толькі атрымліваць, але і дарыць. Абавязковае падчас свята фатаграфаванне імянінніцы. Бо першы дзень народзінаў — самы важны! Прынамсі, для нас — тат і мам.

**Марына СІДАРОВІЧ.**
**Фота аўтара.**



Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

■ Пасля пісьма

# КУПАЛЬНЫ СЕЗОН ЗАВЯРШЫЎСЯ... ПЫТАННІ ЗАСТАЛІСЯ?

*«Гамяльчанам ды і гасцям абласнога цэнтра добра вядомы наш пляж сваёй чысцінёй і прыгажосцю. Там жоўты рачны пясок, гаючае паветра, цень ад дрэў, якія пасля вайны высаджвала моладзь... І раптам на ім з'явілася яшчэ адна адметнасць, — расказвала ў сваім лісце* ***спадарыня Клімава ды іншыя гараджане****. — У жніўні частка пляжа аказалася абнесенай металічнай сеткай, прычым да самай вады: маўляў, прыватная тэрыторыя, уздоўж берага праходу болей няма...*

*Але ж ці лагічна гэта, калі ўся інфраструктура пляжа (кабіны для пераадзявання, навесы ад сонца, лаўкі, пляцоўкі пад гандлёвыя кіёскі і летнія кавярні, электраасвятленне, калонкі і фантанчыкі з пітной вадой, сметніцы, спартыўныя пляцоўкі, пункт пракату ды многае іншае) створана за кошт бюджэту?*

*Лічым, што патэнцыяльным арандатарам неабходна выдзяляць зямлю ў недагледжаных, неабсталяваных участках берага Сожа, з наступным укладаннем туды, у гэтыя ўчасткі, інвестыцый арандатара для таго, каб стварыць для жыхароў горада дадатковыя зоны адпачынку з аказаннем платных паслуг».*



Фота БЕЛТА.

Як патлумачыў у адказ на гэты ліст **першы намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама Павел ПАЎЛАЎ**, зямельны ўчастак плошчай 0,3799 га на тэрыторыі цэнтральнага пляжа г. Гомеля для арганізацыі платнай зоны сфарміраваны на аўкцыённыя таргі на права заключэння дагавора арэнды рашэннем гарвыканкама ад 06.04.2015 г. №254, §6.

Аўкцыённыя таргі ў дачыненні да названага зямельнага ўчастка праводзіліся 15.05.2015 г. і 10.06.2015 г., але ў сувязі з незапатрабаванасцю і адсутнасцю заявак былі прызнаны невынікowымі.

У адпаведнасці з пунктам 33 раздзела 8 Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення аўкцыёнаў на права заключэння дагавораў арэнды зямельнага ўчастка (зацверджана Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26.03.2008 № 462 «Аб некаторых мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2007 г. №667»), пакольки сп. Драбышэўскі быў адзіным заяўнікам для ўдзелу ў аўкцыёне, 30.07.2015 г. гэты зямельны ўчастак выдзелены яму.

Артыкулам 23 Кодэкса аб зямлі ўстаноўлена, што дзяржаўнае рэгуляванне і кіраванне ў галіне выкарыстання і аховы зямель ажыццяўляюць у тым ліку выканаўчыя камітэты ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй, прадугледжанай заканадаўствам.

Гомельскі гарвыканкам як мясцовы орган улады ўпаўнаважаны распараджацца нерухомай маёмасцю, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, меў права сфарміраваць зямельны ўчастак на тэрыторыі Цэнтральнага пляжа г. Гомеля для далейшага прадастаўлення яго з аўкцыённых таргоў.

■ Весткі з месцаў

# «ІГРАЙ, ГАРМОНІК, ЗВІНІ, ПРЫПЕЎКА!»

**Так называлася свята, што адзвінела, адгрымела надоечы ў вёсцы Лучын. І адгрымела — тут не перабольшанне, бо яно спарадзіла столькі выбухаў смеху, столькі звонкіх апладысментаў, а творчы конкурс — яшчэ і столькі спрэчак у журы!..**



Гарманісты спрэс былі як на падбор: з пералівамі і падыходамі заводзілі «страданія», потым «збочвалі» на вядомыя народныя песні альбо выдавалі такую «забойную» польку, што гледачы і журы, не ўтрымаўшыся, пускаліся ў скокі.

Не адставалі і прыпевачнікі, то ўспамінаючы класіку жанру, то падключаючы ўласныя здольнасці... Пенсіянеры, хлебаробы, педагогі, работнікі культуры — усе былі на вышыні. Але журы ўсё ж вылучыла выканаўцаў Галіну Зубікаву, Тамару Міхалішыну і Ірыну Усціненку з вёскі Азяраны, Алену Хапакову з вёскі Крушыніаўка, Інэсу Правалоцкую і Наталлю Гейшалеву з Лучына. Найлепшымі гарманістамі-віртуозамі прызнаны Сцяпан Катовіч з вёскі Крушынаўка, Васіль Рагожнікаў з Рагачова, Аляксандр Цырыкаў з вёскі Азяраны і Усевалад Харошка з вёскі Дварэц. Ім, а таксама найстарэйшым гарманістам Уладзіміру Рыгоравічу Сафонаву і Міхаілу Нічыпаравічу Каралькову, як і ўдзельнікам конкурсу ад сельгаспрадпрыемстваў, былі ўручаны спецыяльныя прызы — ад праекта «Свет інфармацыі, культуры і творчасці — для ўсіх», ад райкама прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу.

...Што да гэтага дадаць? Хіба відавочнае: музычныя густы сёння вельмі розныя, па радыё ды тэлебачанні рэдка пачуеш гармонік, яшчэ радзей — прыпеўкі. Нехта можа сказаць, што адыходзяць старыя традыцыі. Але вось адбыўся раённы конкурс, і стала відавочна, што на добрае — вясёлыя найгрышы і сумныя «страданія», на прыпеўкі і народныя песні — адгукаюцца душы не толькі пажылых, але і маладых.

**Ірына СЕДЛЕР**, *г. Рагачоў*

■ Чалавек — чалавеку

# «ТАКІ МУЖ...» І НЕ ПАТРЭБЕН!

**...Са знаёмым надоечы сядзелі ў скверы, глядзелі, як з клёнаў асыпаецца лісце, ды гаманілі — пра футбол, пра выбары... Міма — павітаўшыся — прайшла маладая пара.**

— Здаецца, толькі ўчора і мы такімі былі, у школу хадзілі на бацькоўскія сходы, — уздыхнуў суразмоўца.

І стаў узгадваць, як хвалілі там яго дачушку, як чырванець давялося за сына: той слабавата вучыўся, не слухаў настаўнікаў. Затое дома...

— Не паверыш, малы папрасіў неяк маці, каб спякла дранікаў. А тая з начной змены прыйшла, стаміўшыся... Давай, кажа, іншым разам. Віця згадзіўся, а пакуль мама спала, сам намыў і абабраў бульбы, здзёр яе на тарцы, дадаў мукі і (усяго шэсць гадочкаў было!) сам напёк аладак. Прычым не толькі для сябе, — выхваляўся бацька, — ён усю сям'ю пачаставаў!.. А ў старэйшых класах у школе ў іх конкурс быў — па выпечцы. Дык Віця торт спёк! Першае месца заняў! Адна жанчына, пакаштаваўшы, так і сказала: «Які зайздросны муж некаму дастанецца! Залатыя рукі ў хлапца!..»

Ён у нас і сапраўды ўсё сам рабіў. Помню, з'явілася ў доме камп'ютарная прыстаўка да тэлевізара, дык ён, шасцікласнік, двое сутак сядзеў, пакуль разабраўся, пакуль вывучыў інструкцыю...

— І як жа склаўся ягоны лёс? — пацікавіўся ўрэшце я.

— Ды спачатку ўсё нармальна ішло: скончыў прафесійна-тэхнічнае вучылішча, стаў добрым сталяром, адслужыў у войску, ажаніўся, купілі яны машыну — хай патрыманую, але Віця давёў да ладу. І дачку сваю вельмі любіў, клапаціўся... Але ж уласнага жытла ў сям'і не было, грошай не хапала. А жонцы, на паўстаўкі працуючы, хацелася ўсяго і адразу, рано на зямлі: уласнай кватэры, убораў, адпачынку на поўдні... Развялася, разлучыла дачку з родным бацькам. Я не апраўдваю: ён, вядома, не ідэал, недахопаў хапае. Але ж з імі трэба нейк прымірацца, калі створана сям'я, пра дзіця думаць, а не чакаць, што заўтра з'явіцца прынц на белым кані, чалавек без заган і вырашыць усе праблемы па век вякоў. Я правільна думаю?

Як на мой погляд — правільна. На нейчы — магчыма, не.

**Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ**, *г. Мінск.*

# СКРЫНКА ЎСПАМІНАЎ

**...Як бы чалавек ні стараўся запомніць нейкія моманты свайго жыцця, з часам яны ўсё роўна сціраюцца. А таму для ўспамінаў я завяла... скрынку.**

Пачалося ўсё, напэўна, з дзяцінства, з першай свядомай восені. Тады я збірала самыя прыгожыя кляновыя лісточкі, паказвала іх маме, а прыбягшы дадому, хавала ў тоўстых кнігах.

Потым, праз нейкі час, я, здаралася, забывалася пра іх, але ж, успомніўшы, ліхаманкава гартала старонкі, шукала запаветныя прывітанні з любімай восені і, вядома ж, знаходзіла! Лісце было іншым: высахшы, яно страчвала сваю жывую пяшчотнасць, свой пах. Але пры гэтым будзіла ўспаміны, дазваляла зноў і зноў перажываць непаўторныя моманты...

Памяць недасканалая: там цяпер столькі ўсяго... Часам — зусім непатрэбнага. А таму самае дарагое я захоўваю ў скрыньцы.

І іншым раю.

**Аляксандра КАМКО**

■ Дзякуй!

# УСЁ ЗМЯНІЛАСЯ. І... НЕ ЗМЯНІЛАСЯ

**У Гродзенскую абласную клінічную бальніцу я трапляў двойчы: у мінулым стагоддзі ды надоечы, у верасні 2015-га...**

Не дзіва, што многае тут змянілася, прычым змянілася, як той казаў, да непазнавальнасці! Выраслі новыя дыхтоўныя карпусы, з'явілася сучаснае абсталяванне для больш дасканалай дыягностыкі, сучасныя метады лячэння... А таксама — царква і каталіцкая капліца, кавярня, крамка, аптэка, газетныя кіёскі, сад...

Але ж ці не самае важнае, што ў гэтай установе нязменнымі засталіся высокая культура медыцынскага абслугоўвання, спрыяльны псіхалагічны клімат, якаснае харчаванне.

Усё гэта не можа не працаваць на папраўку хворых. Таму я хацеў бы шчыра падзякаваць маім дактарам — загадчыку аддзялення Мікалаю ДЗІРОЎСКАМУ, хірургам Дзмітрыю ГАРЭЛІКУ і Юрыю БАБКО, медыцынскім сёстрам Ганне НАВУМЕНЦЫ і Марыі ЯРМУСІК. Яны — прафесіяналы ад Бога. Дык няхай жа Бог і беражэ іх — пад нашым мірным небам!

**Яўген ЛАПЦЕЎ**, *г. Навагрудак*


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, принадлежащего РУП «Белтелеком» на праве хозяйственного ведения, с установлением начальной цены продажи каждого лота, равной одной базовой величине**

| № лота | Наименование | Адрес | Начальная цена (в базовых величинах) | Задаток (в базовых величинах) |
|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Терминал WLL T-100F (с факсом), 66 штук | г. Гомель, пр-т Ленина, 1 | 1 | 1 |
| Лот №2 | Терминал - WLL T-100 (без факса), 670 штук | г. Гомель, пр-т Ленина, 1 | 1 | 1 |
| Лот №3 | WLL-терминал (без факса) Т-100, 4 120 штук | г. Минск, ул. Стебенева, 10 | 1 | 1 |
| Лот №4 | WLL-терминал (без факса) Т-100, 1 350 штук | г. Минск, ул. Стебенева, 10 | 1 | 1 |
| Лот №5 | Терминал - WLL T-100 (без факса), 1 110 штук | г. Могилев, ул. Ленинская, 12 | 1 | 1 |
| Лот №6 | WLL-терминал T-100F (с факсом), 40 штук | г. Могилев, ул. Ленинская, 12 | 1 | 1 |
| Лот №7 | Терминал фиксированный беспроводной связи стандарта IMT MC-450 ETS-1000, 2 штук | г. Могилев, ул. Ленинская, 12 | 1 | 1 |
| Лот №8 | Терминал - WLL T-100 (без факса), 25 штук | г. Минск, ул. Захарова, 57 | 1 | 1 |
| Лот №9 | Терминал - WLL T-100 (без факса), 8 штук | г. Минск, ул. Захарова, 57 | 1 | 1 |

Базовая величина равна 180 000 бел. руб. (Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 29 декабря 2014 г. № 1255)

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить всю стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта (Объектов) за вычетом внесенной им суммы задатка (задатков).
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Информация о затратах доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому Объекту, выставляемому на аукцион.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 (далее – Положение) и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 10 000 000 рублей

Аукцион состоится **27.10.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 23.10.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.
*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества РУП «Белтелеком» (Лот №__),* **проводимом 27 октября 2015 г.**
Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 27.03.2015. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **www.ino.by**

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**
**Государственного предприятия «УКС Фрунзенского района г. Минска»**
**дополнение и изменение к ранее опубликованным проектным декларациям в газете «Звязда»**

**Застройщик** – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, г. Минск, 4-й Загородный, пер., 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 399-53- 94; 256-64-18.

**Режим работы** – 8.45–18.00, обед 13.00–14.00; пятница 8.45–16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Объект «Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32А».

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 2 (две) квартиры:

